Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 КАСТРЫЧНІКА 2014 г. ПЯТНІЦА № 198 (27808) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Аляксандр Лукашэнка сёння правядзе прэс-канферэнцыю для расійскіх журналістаў



Мерапрыемства для прадстаўнікоў расійскіх рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі праводзіцца ўжо ў дванаццаты раз, паведамляе БЕЛТА. У цяперашняй прэс-канферэнцыі Прэзідэнта Беларусі возьмуць удзел звыш 100 прадстаўнікоў СМІ з 50 суб'ектаў Расійскай Федэрацыі. Напярэдадні прэс-канферэнцыі адбыўся традыцыйны прэс-тур яе ўдзельнікаў. У гэты раз расійскія журналісты знаёміліся з сацыяльна-эканамічным развіццём Віцебскай вобласці.

Плануецца, што прамая трансляцыя прэс-канферэнцыі пачнецца ў 11.00 на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей ЧАРОМІН, міністр урада Масквы, кіраўнік дэпартамента знешнеэканамічных і міжнародных сувязяў:**

***«Беларусь аказвае Маскве неацэнную дапамогу пастаўкамі харчавання ва ўмовах санкцый. Нягледзячы на некаторыя цяжкасці на ўласным рынку харчавання, Беларусь значна нарасціла пастаўкі сельгаспрадукцыі ў Маскву. Акрамя таго, беларускі бок прапанаваў кіраўніцтву расійскай сталіцы павялічыць колькасць кірмашоў выхаднога дня, на якіх масквічы могуць набываць беларускія прадукты харчавання. Супрацоўніцтва з Беларуссю з'яўляецца для Масквы стратэгічна важным: ваша краіна займае лідзіруючае становішча сярод гандлёвых партнёраў Масквы не толькі ў СНД, але і ў Еўрасаюзе».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.10.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10660,00 | ■ |
| Еўра | 13630,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 261,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 826,36 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# ТРАДЫЦЫІ — КУЛЬТУРА — РАЗВІЦЦЁ

*У Магілёве прайшоў Міжнародны форум «Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця грамадства». Дзеячы культуры і мастацтва Магілёўшчыны і іншых рэгіёнаў Беларусі, а таксама Расіі, Францыі, Літвы, Азербайджана, Арменіі, Румыніі ўжо трэці раз збіраюцца ў нашым гасцінным горадзе, каб аб'яднаць сілы тэарэтыкаў і практыкаў розных краін для вырашэння праблем захавання традыцыйнай культуры. А народныя майстры Магілёўшчыны, якія прывезлі на форум свае работы і нават цэлыя майстар-класы, — найлепшае сведчанне таго, што прадмет абмеркавання на міжнародным узроўні самы што ні ёсць сучасны і актуальны.*



Фота БЕЛТА.

■ Аб надвор'і і не толькі

# КАСТРЫЧНІК БЯРЭ СВАЁ

## У ноч на нядзелю месцамі да мінус 7

**У бліжэйшыя суткі надвор'е на тэрыторыі Беларусі рэзка зменіцца, бо да нас рухаюцца вільготныя паветраныя масы з боку поўначы Еўропы, паведаміў начальнік метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Аляксандр БЯГАНСКІ.**

У суботу мы трапім у зону павышанага ціску, якая сфарміравана ў халодным арктычным паветры. Будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі туман. Тэмпература паветра ў ноч на суботу — амаль паўсюдна замаразкі да 0—мінус 4 градусаў, толькі месцамі плюс 1-5 градусаў. Удзень чакаецца ўсяго 2-8 цяпла, а па паўднёвым захадзе — да плюс 10 градусаў. Зусім холадна будзе і ў ноч на нядзелю, калі прагназуюцца замаразкі да мінус 4 градусаў, а раніцай месцамі стане яшчэ халадней — да 5-7 марозу. Удзень з боку Балтыйскага мора да нас завітае франтальны раздзел, які прынясе кароткачасовыя дажджы. Удзень тэмпература паветра павялічыцца толькі да плюс 3-10 градусаў.У першыя дні наступнага тыдня да нас завітае крыху цяплейшае паветра з Атлантыкі. Будзе няўстойлівае надвор'е з кароткачасовымі дажджамі, але пацяплее. Мінімальная тэмпература ўначы стане 3-10 цяпла, а



максімальная ўдзень — плюс 7-13 градусаў, на поўдні — да 15-17 цяпла. Аднак сіноптыкі прагназуюць, што пацяпленне ўжо ў сераду скончыцца і зноў стане «да дрыжыкаў».

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Дачакаліся цяпла

**Сёння ў мінскія кватэры павінна пачаць паступаць цяпло.**

Паводле рашэння Мінгарвыканкама, з 17 кастрычніка цяпло пачне паступаць у жылыя дамы, інтэрнаты, гасцініцы, басейны, агульнагарадскія лазні, будынкі навучальных устаноў. Як правіла, пусканаладачныя работы і выпусканне паветра з сістэмы займаюць 4-5 дзён. Цяпло будзе падавацца ў дамы не адразу, а паэтапна: па 20—25% дамоў за дзень. Пасля ўключэння сістэмы ацяплення адрэгулююць, каб у кватэрах не было занадта горача або занадта холадна. Калі ў жыхароў узнікнуць праблемы, варта звярнуцца ў жыллёва-камунальныя службы для іх ліквідацыі. Пры тэмпературы вонкавага паветра, вышэйшай за 10 градусаў, ацяпленне памяшканняў праходзіць у рэжыме прапальвання.

Ацяпленне ў школах і дзіцячых садках, бальніцах, іншых медыцынскіх і сацыяльных установах Мінска ўключылі яшчэ 3 кастрычніка. Згодна з правіламі, цяпло спажыўцам першай групы пачынаюць падаваць, калі на працягу пяці дзён сярэднясутачная тэмпература паветра трымаецца ніжэй за 10 градусаў. Жылфонд пачынаюць ацяпляць пры пяцідзённай сярэднясутачнай тэмпературы, ніжэйшай за 8 градусаў.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК**

# ПА ЗАКОНАХ РЫНКУ І СУМЛЕННАСЦІ

## Мы гатовы прыняць усіх украінцаў, якія захочуць прыехаць сюды жыць і працаваць

**Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з кіраўніцтвам АТ «Матор Січ» (Украіна), паведамляе БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што запрасіў кіраўніцтва кампаніі, каб з першых вуснаў пачуць пра задумы і перспектывы працы АТ «Матор Січ» у Беларусі. Паводле слоў Прэзідэнта, ён занепакоены працай некаторых прадпрыемстваў, па іх далейшай дзейнасці неабходна прымаць рашэнні. Адным з такіх прадпрыемстваў з'яўляецца Аршанскі авіярамонтны завод, у савет дырэктараў якога ўваходзіць кіраўніцтва АТ «Матор Січ».

«Я яго захаваю і хачу, каб гэтае прадпрыемства і гэты аэрадром развіваліся», — агучыў Аляксандр Лукашэнка сваю пазіцыю наконт завода ў Оршы. Кіраўнік дзяржавы дадаў, што для яго вышэйназванае прадпрыемства з'яўляецца вельмі важным.

«Калі б вы прыйшлі на гэтае прадпрыемства перакантавацца, як у нас казалі, або перажыць нейкія часы, або зрабіць яшчэ нешта другараднае, і не было перспектывы — усё роўна, гэта акцыянернае таварыства ці не, набылі яго ці не набылі, — у нас ёсць жорсткі вопыт паводзін з такімі акцыянерамі і такімі «прышэльцамі», — адзначыў беларускі лідар. Але, па словах Аляксандра Лукашэнкі, Аршанскі авіярамонтны завод працуе, можа, не на поўную магутнасць, але «не горш, па меншай меры, чым было, нават лепш працуе». Прэзідэнт адзначыў, што па гэтай прычыне і вырашыў сустрэцца з кіраўніцтвам кампаніі, перш чым прымаць рашэнне аб далейшым лёсе прадпрыемства.

«Вы, вядома, можаце падумаць, што я не рынкава разважаю, бо прадпрыемства прыватнае. Ведаеце, калі б вы яго стварылі з нуля, магчыма, я б не ўмешваўся ў пытанні дзейнасці прадпрыемства, за выключэннем правоў работнікаў, у тым ліку кіраўнікоў. Вось іх правы: яны павінны працаваць, атрымліваць дастойную заробатную плату, іх ніхто не павінен крыўдзіць. І каб прадпрыемства працавала па законе. Усё! Далей я нікуды не ўмешваюся, калі гэта прыватнае прадпрыемства, створанае сваімі рукамі. Калі яно прыватызавана, у нас практыка такая, што мы яго кантралюем», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён звярнуў увагу на тое, што Аршанскі авіярамонтны завод быў створаны народам.

«Мы такім чынам ставімся. Можа быць, няправільна, але думаю, што людзі, якія працуюць ва Украіне, сёння вельмі добра разумеюць, што правільна, а што няправільна. Я вельмі баюся прышлых алігархаў сюды, вельмі баюся, каб гэтыя алігархі ў нас, не дай Божа, не з'явіліся ды і не пачалі кіраваць краінай, як гэта прынята, не будзем паказваць пальцам, у іншых дзяржавах. Таму я вельмі асцярожна да гэтага пытання стаўлюся», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Вы павінны ведаць маю ідэалогію і мой падыход да гэтых пытанняў. Калі мы з вамі вызначымся і дамовімся будаваць адносіны, выходзячы менавіта з гэтых ідэалагічных пастулатаў, то мы заўсёды будзем працаваць паспяхова і вы ніколі не будзеце мець праблем у Беларусі. Гэта я вам гарантую», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Прашу, каб вы не зыходзілі з цяперашняй сітуацыі: вось цяжкавата недзе ва Украіне, трэба праз Беларусь працаваць з Расіяй. Я гэта нават не ўтойваю — гэта правільна. Я і Прэзідэнту Расіі сказаў: «Буду запрашаць усіх украінцаў, якія да мяне прыедуць, жыць, працаваць з намі, праз нас з вамі. І вы павінны гэта разумець», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Па словах беларускага лідара, сваю пазіцыю ён агучыў і ўкраінскаму кіраўніцтву.

■ Наш экспарт

# АТРЫМАЛІ ПАСТАЯННУЮ «ПРАПІСКУ»

## Пастаўкі беларускіх мінеральных угнаенняў займаюць ужо амаль трэць бразільскага рынку

**Беларуская калійная кампанія на мінулым тыдні падпісала пагадненне з буйнейшай кампаніяй Rocha аб арганізацыі захоўвання і апрацоўкі грузаў у бразільскім порце Паранагуа, а таксама на арэнду мытных складоў у Бразіліі. Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведамілі ў прэс-службе БКК.**

Эксперты бразільскага рынку ўпэўнены, што двухбаковае супрацоўніцтва істотна палепшыць лагістыку паставак і сэрвісу для менш буйных кліентаў у рэгіёне і дае магчымасць БКК пастаўляць тавар пакупнікам у самыя кароткія тэрміны, выконваючы, у тым ліку, і экстранныя заказы праз пастаўку прадукцыі з мытных складоў.

**Кіраўнік айчыннай кампаніі Канстанцін ДЗЕДУК** лічыць, што новыя арэндаваныя мытныя склады абсталяваны па апошнім слове тэхнікі і валодаюць сучаснай інфраструктурай. Цяпер выкарыстанне гэтых складоў з'яўляецца адным з самых эфектыўных метадаў вырашэння праблем, якія звязаны з перагружанасцю партоў і ростам платы за прастойванне судна. Адзначым, што на порт Паранагуа прыпадае каля 40% усіх паставак імпартных угнаенняў у Бразіліі, нагрузка на порт вельмі вялікая, асабліва ў разгар сезона. Падпісаўшы пагадненне на арэнду мытных складоў у гэтым порце, Беларуская калійная кампанія атрымала значную канкурэнтную перавагу. Плюсы такога супрацоўніцтва падвойваюцца, бо з мытнага склада тавар можна прадаць у іншы штат Бразіліі без дадатковых пошлін.

Аперацыі ў межах гэтага пагаднення ўжо здзяйсняюцца: разгрузка першага судна з партыяй грануляванага хлорыстага калію ў аб'ёме 25 тысяч тон была паспяхова завершана. У планах БКК — ажыццяўленне рэгулярных адгрузак у порт Паранагуа ў мэтах забеспячэння дастатковай колькасці тавару на складах і пастаўкі прадукту найбольш эфектыўным спосабам. Такім чынам, сумеснымі намаганнямі БКК і Rocha будуць значна ўдасканалены як лагістычная інфраструктура, так і аперацыйная дзейнасць, што звязана з пастаўкамі калійных угнаенняў у Бразіліі.

Неабходна адзначыць той факт, што сучасная Беларуская калійная кампанія зарэкамендавала сябе надзейным дзелавым партнёрам і дысцыплінаваным гульцом на рынку, а таксама ў першым паўгоддзі сёлета стала пастаўшчыком нумар 1 у Бразіліі, заняўшы амаль 30% долі на гэтым рынку.

**Сяргей КУРКАЧ** ■

■ Май на ўвазе!

# ДАВЕДКА КОШТАМ... 600 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ ЗА ХВІЛІНУ

**Апошнім часам пачасціліся звароты ў РУП «Белтэлекам», звязаныя з аказаннем насельніцтву рознымі недзяржаўнымі структурамі разнастайных інфармацыйна-даведачных паслуг па тэлефоне. Скаргі спажыўцоў звязаны з тым, што званок у такія службы становіцца для іх непрыемным сюрпрызам пры атрыманні штомесячнага рахунку за стацыянарны тэлефон. Ён можа даходзіць да 600 тысяч рублёў за хвіліну спалучэння.**

Але разбор па кожным такім звароце, як правіла, прыводзіць да несуцяшальных для абанента высноў. У большасці выпадкаў мела месца няўважлівасць абанента: хтосьці не дачытаў рэкламную аб'яву да канца, а хтосьці — няўважліва праслухаў галасавое паведамленне, якое папярэднічала спалучэнню з аператарам.

Размова ідзе аб актыўна рэкламуемых у сродках масавай інфармацыі юрыдычных кансультацыях, паслугах па працаўладкаванні і іншых. Такія паслугі прадастаўляюцца з выкарыстаннем трохзначнага набору нумару або доўгіх нумароў фармату 8 902 АВСхххх, дзе АВС — код вобласці прадастаўлення паслуг, або 8 602 60хххх

Платныя кансультацыі па фіксаваным нумары тэлефона прадастаўляюць спецыялісты недзяржаўных даведачна-інфармацыйных службаў, якія заключылі дагавор з кампаніяй «Белтэлекам». Але «Белтэлекам» забяспечвае толькі тэхнічны доступ абанентаў да гэтых даведачных службаў. Адказнасць перад абанентамі за прадастаўленне самых даведачна-інфармацыйных паслуг, уключаючы якасць аказваемых паслуг і вызначэнне іх кошту, нясе непасрэдна ўладальнік платнай даведачна-інфармацыйнай службы.

Для папярэджвання пра тое, што паслуга платная, і для прадастаўлення інфармацыі пра сваю паслугу юрыдычная асоба — уладальнік платнай даведачна-інфармацыйнай службы — абавязана размясціць галасавое паведамленне на працягу нетарыфікаванага інтэрвалу. Нетарыфікаваны інтэрвал — гэта галасавое паведамленне даведачнай службы, а таксама тэхналагічны інтэрвал, роўны тром секундам, — дастатковы для таго, каб абанент змог паспець пакласці трубку, калі ўстаноўлены кошт паслугі яго не задавальняе або абанент перадумаў карыстацца паслугай.

Галасавое паведамленне павінна змяшчаць найменне службы, кароткае апісанне прадастаўленай паслугі, указанне кошту званка або паведамленне пра тое, што паслуга — платная, і паведамленне наступнага зместу: «Калі вы застаняцеся на лініі, то даяце згоду на аплату паслугі».

Калі вышэйпералічаныя правілы не былі захаваны, то спажывец мае права патрабаваць вярнуць яму грошы.

Плата за карыстанне паслугай, якая прадастаўляецца даведачнай службай, уключаецца ў агульны рахунак за паслугі электрасувязі «Белтэлекам», у якім паслугі даведачнай службы вылучаюцца асобнай пазіцыяй.

**Надзея НІКАЛАЕВА** ■

## НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ВАРТАЎНІК З'ЕХАЎ НА «ХАМЕРЫ»

**Малады мінчанін, які працаваў вартаўніком у адным з гаражных кааператываў, украў «Хамер», што быў прыпаркаваны на стаянцы аб'екта, які ён жа і ахоўваў. А пасля патрапіў на аўтамабілі ў дарожна-транспартнае здарэнне.**

Як потым высветлілася, ключы ад «Хамера» 25-гадоваму вартаўніку, змяняючыся пасля сутачнага дзяжурства, пакінуў яго калега, папрасіўшы перадаць іх уладальніку транспартнага сродку. Малады ж чалавек не прамінуў скарыстацца рэдкай магчымасцю пракаціцца на дарагой машыне. Ноччу, пакінуўшы сваё працоўнае месца, ён накіраваўся ў адну з вёсак Мінскай вобласці. Вяртаючыся назад у сталіцу, на адной з вуліц хлопец і здзейсніў ДТЗ. Пасля чаго кінуў «Хамер» і збег, аднак неўзабаве быў затрыманы. Заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## КАНІКУЛЫ ПАД ПЕРАСТУК КОЛАЎ

**Беларуская чыгунка загадзя прымае меры па забеспячэнні перавозак пасажыраў падчас школьных канікул, а таксама ў выхадныя і святочныя дні лістапада: у межах краіны і ў міжнародных зносінах будзе прызначана больш за 20 дадатковых цягнікоў.**

— У тым ліку 3 лістапада будзе курсіраваць дадатковы цягнік № 688 Брэст — Магілёў, 6 лістапада — цягнікі № 667 Мінск — Брэст, № 672 Мінск — Гомель, № 638 Мінск — Гомель, № 637 Гомель — Мінск, № 693 Полацк — Мінск, № 694 Мінск — Полацк, — распавялі падрабязнасці ў прэс-цэнтры магістралі. — 7 лістапада будуць прызначаны цягнікі № 666 Брэст — Мінск, № 671 Гомель — Мінск, № 638 Мінск — Гомель, № 637 Гомель — Мінск. У міжнародных зносінах дадатковыя цягнікі прызначаны па маршруце Брэст — Масква — Брэст.

Больш падрабязную інфармацыю пра час адпраўлення прызначаных дадатковых цягнікоў можна атрымаць на сайце Беларускай чыгункі, а таксама ў чыгуначных касах і па тэлефонах даведачных службаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПАСТАЯЛІ ЗА СЯБЕ

### У Мсціслаўскім раёне 84-гадовы пенсіянер абясшкодзіў злачынцу, які паквапіўся на яго маёмасць...

Неаднаразова судзімы 51-гадовы жыхар Чавускага раёна ў стане алкагольнага ап'янення з мэтай крадзяжу разбіў акно і патрапіў у дом пенсіянера, гаворыцца на сайце Следчага камітэта Беларусі. Там яму ўпадабалася чыгунная патэльня. Аднак у гэты момант зламысніка заспеў гаспадар дома. Нязванага госця гэта, аднак, не спыніла. Больш за тое, той дастаў нож і пачаў пагражаць пенсіянеру. Аднак пажылы мужчына не разгубіўся і аказаў супраціўленне — абухом сякеры ўдарыў злачынцу па галаве. Падазраваны затрыманы, яго дзеянні класіфікаваны як разбой.

### ...А ў Шчучыне 19-гадовая настаўніца ўступіла ў схватку з неаднаразова судзімым мясцовым жыхаром

Той адабраў у яе сумачку і кінуўся бегчы... Усё адбылося каля апоўначы на вуліцы Някрасава. Паводле інфармацыі прэс-службы Гродзенскага аблвыканкама, каля аднаго з дамоў мужчына, які «закладваў за каўнер», падцярог выпадковую прахожую. Ёй аказалася маладая настаўніца адной з мясцовых школ. Дзяўчына пасля нападу не разгубілася — наадварот, дагнала рабаўніка і аказала яму супраціўленне. Дапамаглі ёй падаспеўшыя грамадзяне. Пасля злачынцу (за плячыма якога чатыры судзімасці і які толькі нядаўна выйшаў з месцаў пазбаўлення волі) перадалі міліцыянерам. Следчы камітэт завёў крымінальную справу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ГРЫП НЕ ПРОЙДЗЕ...

**Сёлета прышчапіць бясплатна ад грыпу плануецца каля 780 тысяч жыхароў сталіцы — каля 40 працэнтаў гараджан. За кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў у Мінску прышчапляюць вакцынай кітайскай вытворчасці «Флюваксін»: яна выкарыстоўваецца ў нашай краіне на працягу чатырох гадоў і даказала сваю эфектыўнасць і бяспечнасць.**

Бясплатна прышчэпку могуць зрабіць людзі з высокай рызыкай развіцця цяжкіх працігрыпозных ускладненняў (хранічнымі захворваннямі сардэчна-сасудзістай, дыхальнай і эндакрыннай сістэм і асобы ва ўзросце за 65 гадоў), а таксама грамадзяне, якія маюць высокую рызыку інфіцыравання грыпам: дзеці, медыцынскія работнікі, супрацоўнікі МНС, МУС і іншыя.

Па словах загадчыцы эпідэміялагічнага аддзялення Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ірыны Глінскай, чакаецца, што ў гэтым эпідсезоне ў Беларусі будуць цыркуляваць два варыянты віруса грыпу, з улікам якіх быў зменены састаў вакцын. Таму ў гэтым годзе асабліва актуальна сфарміраваць ахову супраць захворвання з дапамогай прышчэпкі. Спецыялісты раць паклапаціцца пра прышчэпку і тым, каму не давялося рабіць бясплатную вакцынацыю. Кошт платнай прышчэпкі вар'іруецца ў медустановах ад 65 да 150 тысяч рублёў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Новае ў заканадаўстве

# ШТО ВІНЕН, АДДАЦЬ ПАВІНЕН

## Прымусіць нядобрасумленных людзей разлічыцца па даўгах стала лягчэй

**Закон мае доўгую назву: «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях удасканалення грамадзянскага судаводства», але сутнасць яго досыць простая — зрабіць так, каб рашэнне суда выконвалася. Пра новыя заканадаўчыя меры супраць нядобрасумленных даўжнікоў мы распыталі старшыню Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Лілію МАРОЗ.**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

***— Лілія Францаўна, новы закон уступіў у сілу 21 ліпеня. Ці будзе ваша камісія вывучаць, як ён працуе на практыцы?***

— Думаю, мы запланаем маніторынг гэтага закону, але ён павінен прапрацаваць не менш за год. Гэта вельмі цікавая і важная для людзей тэма.

***— Таму што праблема выканання судовых рашэнняў застаецца актуальнай?***

— Безумоўна. Важна вынесці законнае абгрунтаванае судовае рашэнне, але не менш важна, каб яно было выканана, мела вынік, не засталося толькі на паперы. Уявіце сабе: вы пазычылі грошы. Суд вынес рашэнне, каб грошы вам вярнулі, але даўжнік пасля такога рашэння суда паспяшаўся пазбавіцца ад маёмасці, і справядлівае рашэнне суда не прынесла выніку. Нярэдка людзі ў такой сітуацыі хітруюць: маёмасць афармляюць на іншых, не заключаюць працоўных пагадненняў. Таму змены ў Грамадзянскі працэсуальны кодэкс у асноўным накіраваны на тое, каб быў вынік па судовых рашэннях і іншых выканаўчых дакументах.

Значная частка новага закону прысвечана выканаўчай вытворчасці, перш за ўсё — прывядзенню Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса ў адпаведнасць з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 530 ад 29 лістапада 2013 года «Аб некаторых пытаннях удасканалення арганізацыі выканання судовых пастаноў і іншых выканаўчых дакументаў», які стварыў адзіную сістэму органаў прымусовага выканання.

***— Што ў законе самае істотнае?***

— Пашырэнне паўнамоцтваў судовых выканаўцаў. Як я ўжо сказала, з пачатку гэтага года створана адзіная сістэма органаў прымусовага выканання, якая складаецца з галоўнага ўпраўлення прымусовага выканання Міністэрства юстыцыі, тэрытарыяльных органаў і раённых аддзелаў. Вылучэнне органаў прымусовага выканання са складу судоў у асобную сістэму было лагічным, бо ў сваёй працы яны выйшлі за межы судовай дзейнасці. У апошні час толькі 30% пастаноў, якія яны выконвалі, былі судовымі рашэннямі, а 70% прыпадала на іншыя выканаўчыя дакументы: пратаколы камітэта дзяржмаёмасці, пракуратуры, розных міністэрстваў...

Гэтая структура пакуль складаецца з дзяржаўных служачых і не мае ваенізаванага складніка, аднак, цалкам магчыма, што мы прыйдзем і да гэтага, падобна таму, як пабудавана такая структура ў Расіі. Работа судовых выканаўцаў складаная, патрабуе пэўнай мужнасці. Падчас арышту, спагнання, рэалізацыі маёмасці, высялення і канфіскацыі даўжнікі могуць аказваць супраціўленне, у тым ліку фізічнае.

Пасля ўступлення ў сілу новага Закона судовы выканаўца ў рамках выканання дакумента можа на працягу некалькіх хвілін арыштаваць любы рахунак, маёмасць, спыніць здзелку без пастановы суда. Раней для гэтага патрэбна была пастанова суддзі, цяпер дастаткова пастановы самога судовага выканаўцы.

**Пасля ўступлення ў сілу новага Закона судовы выканаўца ў рамках выканання дакумента можа на працягу некалькіх хвілін арыштаваць любы рахунак, маёмасць, спыніць здзелку без пастановы суда.**

Акрамя таго, судовы выканаўца цяпер можа бесперашкодна заходзіць на тэрыторыю альбо ў памяшканне індывідуальнага прадпрымальніка і юрыдычнай асобы. Яшчэ адна навіна — судовы выканаўца мае права ўскрыць памяшканне даўжніка без яго згоды, калі той яго сістэматычна не дапускае. Але ўскрыць памяшканне альбо вароты на тэрыторыю ў гэтым выпадку можна ўжо толькі па рашэнні суда.

***— Сістэматычна — гэта колькі разоў?***

— Два і больш.

***— Якія яшчэ правы дае новы закон судовым выканаўцам?***

— Па сваёй ініцыятыве яны цяпер могуць рэгістраваць маёмасць даўжніка. Напрыклад, калі даўжнік не рэгіструе пабудаваны катэдж, каб той не быў апісаны, спаганяны і рэалізаваны ў кошт вяртання доўгу. Альбо калі даўжнік прымае спадчыну, робіцца ўласнікам маёмасці, але не рэгіструе яе.

**Адмаўленне даўжніка ад добраахвотнага выканання судовага рашэння будзе каштаваць даражэй. Пры прымусовым спагнанні сістэме судовага выканання належыць 10% ад кожнай сумы.**

Таксама па сваёй ініцыятыве судовы выканаўца можа аб'явіць даўжніка ў вышук, атрымаць інфармацыю, якая змяшчае персанальныя звесткі. Цяпер выканаўца мае доступ у сістэму «Пашпарт» МУС, базу рэгістрацыі аўтатранспартных сродкаў ДАІ, рэестр адрасоў дзяржаўнага зямельнага кадастру і іншыя базы. Гэта вельмі зручна, бо людзі, як толькі суд выносіць рашэнне не на іх карысць, імкнуцца пазбавіцца ад любой маёмасці: кватэру «прадаюць», аўтамабіль «дораць».

Пашырыўся і пералік прадметаў, якія судовы выканаўца мае права апісваць і рэалізоўваць: адзіны тэлевізар, прафесійны інвентар, калі яго кошт перавышае 1000 базавых велічынь, паенакапленні. Нельга рэалізоўваць спецыяльныя сродкі руху для інвалідаў, дзяржаўныя ўзнагароды і прызы.

Яшчэ адна новая норма датычыцца права судовага выканаўцы выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі: аўдыя-, відэазапіс, кіна- і фотаздымка, а таксама выкарыстоўваць электронны дакументазварот і інфармацыйныя тэхналогіі. Гэта значыць, што ён можа з дапамогай электронных сродкаў камунікацыі рассылаць паведамленні пра дату і месца сустрэч.

***— Падарыць усю сваю маёмасць даўжнік можа і загадзя, калі толькі плануе не вяртаць пазыку, крэдытныя сродкі альбо калі, скажам, пазбягае падаткаабкладання.***

— Сапраўды, такое бывае. Калі я працавала ў натарыяльнай канторы, то сутыкалася з выпадкамі, калі дырэктар, напрыклад, прыватнага ўнітарнага прадпрыемства перапісваў усю сваю маёмасць на жонку. Я папярэджвала, што такія шлюбныя дагаворы могуць быць прызнаны несапраўднымі з-за таго, што здзелка здзейснена на крайне нявыгадных для аднаго з бакоў умовах.

Што тычыцца судовых выканаўцаў, то яны могуць дзейнічаць толькі пасля паступлення адпаведнага выканаўчага дакумента, заявы спагнанніка, а таксама ў іншых выпадках, устаноўленых Грамадзянскім працэсуальным кодэксам.

***— Для даўжнікоў таксама вызначаны новыя абавязкі?***

— Так. Закон замацаваў абавязак даўжніка даваць судоваму выканаўцу звесткі пра маёмасць, а таксама пра крыніцу даходаў. Размова ідзе пра дэкларацыю даходаў перад судовым выканаўцам. 16 верасня 2014 года пастанова Савета Міністраў Беларусі зацвердзіла адпаведную форму.

**На жаль, ні распіска, ні выканаўчы надпіс натарыуса не з'яўляюцца гарантыяй поўнага і своечасовага вяртання доўгу. Такой гарантыяй можа быць заклад.**

Калі даўжнік не падае такіх звестак альбо дае недакладную інфармацыю, то нясе адміністрацыйную адказнасць.

***— У які тэрмін даўжнік павінен прадаставіць гэтыя звесткі?***

— Як толькі судоваму выканаўцу паступае адпаведны выканаўчы дакумент, ён выклікае даўжніка і прапануе яму добраахвотна выканаць судовае рашэнне. Даўжнік можа пакласці грошы на дэпазіт, аддаць непасрэдна спагнанніку, але калі ён добраахвотна гэтага не робіць, выканаўца прапануе запоўніць адпаведную форму. Маючы пад рукой доступ да ўсіх баз персанальных звестак, судовы выканаўца адразу можа распачаць працэсуальныя дзеянні па выканаўчай вытворчасці: спыніць рух грошай, арыштаваць маёмасць. А калі ён убачыць, што даўжнік нешта схаваў, то складае пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні, які цягне за сабой выплату штрафу.

Пры змене месца працы і месца жыхарства даўжнік абавязаны паведамляць пра гэта судоваму выканаўцу на працягу трох дзён. Раней такі абавязак быў прадугледжаны толькі па аліментных справах, цяпер — па ўсіх. Інакш — штраф.

Трэба ведаць і тое, што адмаўленне даўжніка ад добраахвотнага выканання судовага рашэння будзе каштаваць даражэй. Пры прымусовым спагнанні сістэме судовага выканання належыць 10% ад кожнай сумы (раней было 5%). Ёсць такія дзеянні судовых выканаўцаў, якія грашыма не ацэньваюцца — высяленне, усяленне, ліквідацыя перашкод у карыстанні маёмасцю, перапланіроўка і падобныя. Кожнае такое дзеянне таксама абкладаецца пошлінай — 5 базавых велічынь для грамадзяніна і 10 базавых велічынь для юрыдычнай асобы.

Вызначаны адзіны для ўсіх від даў спагнання памер утрымання з заробку і іншых даходаў. Раней па выканаўчых лістах можна было вылічыць з заробку або пенсіі 20%, цяпер — палову.

***— Якія рашэнні суда найчасцей патрабуюць прымусовага выканання?***

— У асноўным па грамадзянскіх справах: спагнанне аліментаў, пазыкі, маральнай і матэрыяльнай шкоды, выдаткаў на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, усяленне, высяленне і перапланіроўка... Па крымінальных справах, як правіла, адбываецца канфіскацыя.

***— Як быць з тымі, хто не працуе, не мае ніякай маёмасці і не аддае тое, што павінен?***

— Абмяркоўвалася норма адміністрацыйнага арышту ў такіх выпадках, але з ёй заканадаўцы не пагадзіліся. Праблема гэтая застаецца пакуль адкрытай. Мая знаёмая ў свой час пазычыла грошы, натарыяльна засведчыла пазыку і на працягу вось ужо 8 гадоў вяртае суму, якая, безумоўна, усё больш абясцэньваецца. Маёмасці, якую можна рэалізаваць, у даўжніка няма, а заробак маленькі.

На жаль, ні распіска, ні выканаўчы надпіс натарыуса не з'яўляюцца гарантыяй поўнага і своечасовага вяртання доўгу. Такой гарантыяй можа быць заклад. Заклад рэгіструецца, і закладзеную маёмасць накладаецца забарона яе рэалізацыі, пакуль даўжнік не верне пазыку.

***— Ці дастаткова, на ваш погляд, новых захадаў, каб праблема выканання судовых рашэнняў была знятая?***

— Час пакажа. Мы робім усё, каб рашэнне суда было рэалізавана, але любых мер будзе недастаткова без адпаведнай прававой культуры і выхавання. Кожны чалавек павінен сам прытрымлівацца правіла: «калі ўзяў — то вярні, калі пашкодзіў — аднаві».

Тым не менш зроблены вялікі рух наперад. Праз год мы паглядзім статыстыку і падвядзём першыя вынікі работы гэтага закону.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■ Напярэдадні

## ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ Ў ГІСТАРЫЧНЫХ ЛЁСАХ

**Больш як 140 навуковых дакладаў прадставяць удзельнікі міжнароднай канферэнцыі «Першая сусветная вайна ў гістарычных лёсах»**

**Яна адбудзецца 18 кастрычніка ў Вілейцы на Міншчыне. Мерапрыемства збярэ зацікаўленых з 9 краін свету: Беларусі, Украіны, Расіі, Польшчы, Англіі, Славеніі, Казахстана, Кітая, Венгрыі.**

Госці паўдзельнічаюць у пленарным пасяджэнні, у рабоце секцый, наведаюць звязаныя з той вайной памятныя мясціны.

Дадам, што Вілейскі раён праводзіць значную работу па захаванні помнікаў Першай сусветнай. Тут створаны ўнікальны мемарыяльны комплекс памяці Першай сусветнай вайны «Крокі» ў вёсцы Заброддзе на лініі фронту. Жыхары гэтага населенага пункта калісьці прымалі рускіх воінаў на пастой, побач у лесе размяшчаўся ваенны шпіталь, у паходнай царкве якога адпявалі памерлых ад ран і палеглых у бітвах салдат.

Аўтар праекта комплексу Барыс Цітовіч — член Беларускага саюза мастакоў, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». Барыс Барысавіч — ветэран Вялікай Айчыннай, сын кадравага вайскоўца, унук удзельніка Першай сусветнай вайны. Успаміны яшчэ жывых у пачатку 70-х гадоў мінулага стагоддзя сведак, захаваныя фотаздымкі і дакументы, архіўныя матэрыялы дазволілі ўзнавіць мінулае. Пра гэта сведчаць капліčка на месцы дыслакацыі прыфрантавога шпіталя, дзе знаходзіцца 99 воінскіх пахаванняў (у тым ліку 22 брацкія), помнікі на брацкіх магілах каля вёсак Рускае Сяло, Бароўцы, Жарсцвянка, Папоўцы, Порса, драўляная капліца ў гонар благаславёных князёў Барыса і Глеба — заступнікаў воінства, у прытворы якой і месціцца экспазіцыя, прысвечаная падзеям Першай сусветнай вайны.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## ДРАНІКАЎ ХОПІЦЬ НА ЎСІХ

**У Магілёве ўпершыню адбудзецца свята ў гонар любімай ва ўсім свеце стравы**

**Восеньскіх прыгожых фестываляў шмат, але такога, дзе можна было б аддаць даніну павагі ўсенароднай любімай страве беларусаў і не толькі, няма...**

«Чаму?» — спыталі адзін у аднаго самыя неабыякавыя магілёўчане з Цэнтра гарадскіх ініцыятыў і вырашылі наладзіць свята «Дранік-fest».

— Гэта прыклад, калі без адзінага рубля можна зрабіць вельмі карысную справу, — адзначаў адзін з такіх ініцыятыўных людзей, прафесар кафедры гуманітарных дысцыплін Магілёўскага дзяржуніверсітэта харчавання Юрый Бубноў. — Напрыклад, сям'я Арцёменкаў з быхаўскай вёскі Абідавічы нават выдзеліла 5 мяшкоў бульбы.Так што прыходзьце, дранікаў хопіць на ўсіх.

Смачнае мерапрыемства пройдзе на тэрыторыі этнаграфічнага комплексу «Зялёны гай» ужо ў гэтую суботу. У фэсце прымаюць удзел знаўцы сваёй справы. Толькі ад універсітэта харчавання ў конкурсе на самы лепшы і смачны дранік за перамогу пазмагаюцца 3 каманды. Прычым адна з іх, з кафедры гуманітарных дысцыплін, выключна навуковая: у склад яе ўвойдуць дацэнты і нават доктар навук. Дарэчы, ацэньваць стравы будуць таксама прафесіяналы.

Акрамя дэгустацый, наведвальнікаў чакае вясёлая забаўляльная праграма. А яшчэ — магчымасць больш даведацца аб традыцыях народнай культуры і набыць на памяць сувенір у горадзе майстроў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■

■ Сардэчна запрашаем!

# КАМУ — СЯМЕЙНЫ АДПАЧЫНАК, А КАМУ — ПАЛЯЎНІЧЫ ЗАПАЛ

## ДЗЕ СХАВАЦЦА АД ГАРАДСКОГА ТЛУМУ, НЕ АД'ЯЗДЖАЮЧЫ ДАЛЁКА АД СТАЛІЦЫ

**У межах рэспубліканскага конкурсу Белаграпрамбанка на лепшую аграэкасядзібу года «Звязда» працягвае вандраваць па беларускіх вёсках у пошуках самага лепшага месца для адпачынку. Гэтым разам далёка ад сталіцы ад'язджаць не прыйшлося — мы наведалі дзве сядзібы ў Маладзечанскім і Мінскім раёнах.**



Сям'я Карыцькаў толькі пачынае свой шлях у агратурызме.

### ЗАМЕЖНІКІ АЦАНІЛІ!

Каб знайсці сядзібу «Карыцька», трэба праехаць ад Маладзечна 1,5 кіламетра і спыніцца ў вёсцы Насілава. Драўляны двухпавярховы дом з мудрагелістай формы дахам пазнаць лёгка. Каб пабудаваць яго, гаспадары ўзялі крэдыт у банку як маладая сям'я. У доме газавае ацяпленне, на першым паверсе — цёплая падлога. Адначасова камфортна пачувацца тут могуць шэсць чалавек, хаця пры жаданні можна размясціць і дзесяцярых. На ганку нас сустракае маладая гаспадыня Алеся Карыцька, якая першым чынам вядзе паглядзець на адноўленую лазню. Але яе аповед перарывае гук пілавальнага станка. «Гэта муж працуе», — тлумачыць яна. Пазней прызнаецца: ён усё ўмее рабіць сваімі рукамі. Сам пабудаваў дом, цэлымі днямі цяслярыць і нешта майструе. Апошнім часам захапіўся кавальствам: набывае кавадлы і хоча паказваць турыстам майстар-класы. Жонка яго падтрымлівае, ды і сама яна тая яшчэ рукадзельніца: паказала нам некалькі сваіх работ (дэкаратыўныя капялюшыкі, млын) у тэхніцы газетнага пляцення; займаецца і пляценнем з бісеру. Некалі Алеся і турыстаў далучала да свайго майстэрства, і арганізоўвала на сядзібе выставы — нават тэлебачанне мясцовае прыязджала. Праўда, цяпер за гаспадарчымі клопатамі часу для творчасці не застаецца.

**У планах — распрацоўка роварнага маршруту: у ваколіцах ёсць прыгожае возера, царква. Адсюль блізка да Маладзечна, а яшчэ — да толькі-толькі адкрытай пасля рэстаўрацыі рэзідэнцыі Агінскіх у Залессі.**



Частка гадаванцаў падвор'я Рукштаў.

Сям'я Карыцькаў выкупіла суседні ўчастак, дзе гаспадар майструе дзіцячую і спартыўную пляцоўкі. Ёсць тут і пладовы сад. Куплялі і туі, але суседзі іх хуценька «прысабечвалі».

**Апроч магчымасці палюбавацца на шматлікія чучалы дзікіх звяроў і птушак, здабытых спадаром Сяргеем і не толькі, можна і самому паўдзельнічаць у паляванні.**

— Такія рэчы, безумоўна, засмучаюць, — прызнаецца Алеся Карыцька. — Але калі мы за гэту справу ўзяліся, трэба ісці да канца.

Сапраўды, журыцца цяпер не час: сядзіба «Карыцька» ўдзельнічае ў конкурсе ў намінацыі «Лепшы старт», а значыць, зрабіць яшчэ трэба нямала. У планах — распрацоўка роварнага маршруту: у ваколіцах ёсць прыгожае возера, царква. Адсюль блізка да Маладзечна, а яшчэ — да толькі-толькі адкрытай пасля рэстаўрацыі рэзідэнцыі Агінскіх у Залессі. Так што патэнцыял у сядзібы добры: амаль за два гады існавання яе наведалі госці з Расіі, Ліване, Ірландыі, Англіі, Германіі. Летась агулам тут пабывала больш за 260 чалавек.



Казачны дом у «Прылессі».

### ХТО ХОЧА ПАСПАЦЬ НА ВУЛЛЯХ?

— У нас музей сур'ёзны цяпер ёсць, — сустракае нас на сядзібе «Прылессе» паляўнічы, рыбалоў і пчаляр Сяргей Рукшта. Да яго ў госці «Звязда» ўжо наведвалася летась, падчас мінулага конкурсу. Таму нам было асабліва цікава, што ж новага з'явілася на сядзібе за год. Дарэчы, сёлета сядзіба спадара Рукшты заяўлена ў дзвюх намінацыях: «Стыль і гармонія» і «Этнакомплекс».

Варта адзначыць, што месца для адпачынку тут сапраўды зручнае: усяго пяць кіламетраў ад Мінска па Магілёўскай шашы — і вы быццам бы ўжо нават не побач з тлумнай сталіцай, а на ўлонні прыроды. Асабліва гэтае пачуццё ўзмацняецца, калі гаспадар паказвае сваіх гадаванцаў: трусоў, курэй, фазаноў і перапёлак. Аднак і ўсе выгоды цывілізацыі тут ёсць. Маёнтак Сяргея Рукшты складаецца з двух дамоў, прычым першы з іх гаспадару сядзібы дастаўся ў спадчыну ад бацькі і перажыў мадэрнізацыю. Пасля выраслі новы гасцявы дом, лазня, гаспадарчыя пабудовы... Цяпер спадар Сяргей плануе пабудаваць асобны будынак для музея. Праўда, ён будзе драўляны, а не выкладзены з каменю, як іншыя сядзібныя дамы. Дарэчы, каменне гэтае гаспадар сам звозіў з ваколіц, калі працаваў на трактары. Між тым музей абяцае быць цікавым. Апроч ужо бачаных намі шматлікіх прадметаў побыту беларусаў пачатку мінулага стагоддзя, гаспадар абзавёўся новымі экспанатамі па рыбалоўнай тэматыцы. Пакуль што пад паветкай свайго часу чакаюць човен, шматлікія рыбацкія прылады, у тым ліку і старажытныя. Геаграфія іх таксама шырокая — ад Капыльшчыны да Турэччыны.

Калі казаць пра рарытэты і трафеі, немагчыма абмінуць паляўнічую тэматыку, такую дарагую для гаспадара сядзібы. Бо апроч магчымасці палюбавацца на шматлікія чучалы дзікіх звяроў і птушак (сярод якіх — глушэц, сава, алень, казуля, дзік, бабёр, андатра і нават зубр), здабытых спадаром Сяргеем і не толькі, можна і самому паўдзельнічаць у паляванні. Аднак гаспадары «Прылесся» рыхтуюцца здзіўляць турыстаў усё новымі цікавінкамі. Так, неўзабаве адбудзецца закальцоўка новага маршруту ад сядзібы да рыбнай гаспадаркі «Волма» і Смілавіцкай валюшна-лямцавай фабрыкі. А яшчэ гаспадар-бортнік думае над рэалізацыяй новай паслугі — сну на пчаліных вуллях.

— Такая тэрапія ўжо атрымала распаўсюджанне ў некаторых краінах. Вібрацыя, якая ўтвараецца ад пчалінага гудзення, а таксама пахі пчаліных прадуктаў дабратворна ўплываюць на чалавека, — тлумачыць жонка Сяргея Галіна, медработнік.

І хоць ідэя «пчолатэрапіі» яшчэ толькі ў распрацоўцы, уласным мёдам гаспадары сядзібы ўжо частуюць гасцей, так што адпачынак у «Прылессі» мае ўсе шанцы стаць салодкім.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
**Фота аўтара**

■ Узровень

# УЗНАГАРОДА «ЗВЯЗДЗЕ» — З МАХАЧКАЛЫ

**На 3-м Дагестанскім кніжным кірмашы «Таркі-Тау 2014» у Махачкале дыпломам адзначана кніга «Апошні прытулак салдата», што выйшла сёлета ў Выдавецкім доме «Звязда».**

— Кніжны кірмаш, заснаваны міністэрствамі культуры і друку і інфармацыі Рэспублікі Дагестан, Нацыянальнай бібліятэкай Дагестана, Дагестанскім філіялам Расійскага фонду культуры, — расказвае рэдактар аддзела часопіса «Полымя» Рагнед Малахоўскі, — праходзіць трэці год запар. Удзельнічаюць у выставе ў асноўным выдаўцы з рэгіёнаў Расіі, блізкіх да Паўночнага Каўказа. Але былі і госці з Грузіі, Ірана, ЗША. Вельмі шмат сучасных акцый праводзяць арганізатары — і флэшмоб, і розныя літаратурныя марафоны. Галоўная мэта — паспрыяць скарачэнню дарогі кнігі, рукапісу ад пісьменніка да выдаўца, бібліятэкара, літаратурнага крытыка, чытача. Праводзілася шмат сустрэч з пісьменнікамі Санкт-Пецярбурга і Масквы. Каўказскі дом перакладчыка, які ўзначальвае Марат Гаджыеў, адну з творчых імпрэз прысвяціў грузінскай і беларускай паэзіі. Уразіў і паэтычны гадэкан (спаборніцтва ў творчым самавыяўленні) «Салам, Махачкала». Мне пашчасціла прачытаць у час гэтага сапраўднага свята вершы на беларускай мове.




Фота Наталлі АСМОЛЬ.

Выдавецкі дом «Звязда» быў прадстаўлены на кірмашы многімі цікавымі навінкамі. Найперш — кніжнай серыяй «Сугучча сэрцаў», альманахам «Сугучча», кнігай «Апошні прытулак салдата». Мартыралог пахаванняў Першай сусветнай вайны і атрымаў дыплом кірмашу «Таркі-Тау 2014». А яшчэ падпісана пагадненне аб творчым супрацоўніцтве паміж Каўказскім домам перакладу і Выдавецкім домам «Звязда».

**Мікола БЕРЛЕЖ**

■ Будзем пільнымі!

# ПРАЯВІЎ НЕАБЫЯКАВАСЦЬ

## На Магілёўшчыне затрымалі п'янага кіроўцу па званку ў міліцыю

**Не выключана, што гэтая паездка магла каштаваць камунебудзь жыцця. У паветры, якое выдыхнуў затрыманы ў Дрыбінскім раёне кіроўца, прыбор зафіксаваў 0,8 праміле. Усе шасцёра пасажыраў, якія знаходзіліся ў яго «Фордзе Мандэа,» таксама аказаліся нападпітку.**



— На вадзіцеля склалі адразу некалькі пратаколаў — за кіраванне ў стане алкагольнага ап'янення, за адсутнасць страхоўкі і дзяржтэхагляду, за парушэнне правілаў перавозкі пасажыраў, за невыкарыстанне рэменя бяспекі, — паведаміла **інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Таццяна СТАРАСОТНІКАВА.**

Па загадзе начальніка УУС Магілёўскага аблвыканкама пільны грамадзянін быў адзначаны падзякай і грашовай узнагародай, якія ён атрымаў з рук начальніка абласной Дзяржаўтаінспекцыі Міхаіла Неўмяржыцкага. Дарэчы, істотную дапамогу ў затрыманні правапарушальніка супрацоўнікам ДАІ аказаў першы намеснік пракурора Магілёўскай вобласці Алег Пімашкоў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

ЗВЯЗДА
НАПЕРАД У МІНУЛАЕ
Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# «ВЫТОКІ» НАТХНЯЮЦЬ І РАДУЮЦЬ

## Якія песні гучаць на Палессі?

**Само слова «глыбінка» ў кожнага з нас выклікае розныя асацыяцыі. Адны ўспамінаюць летнія вакацыі, калі ездзілі да бабулі, іншыя правялі ў вёсцы значную частку жыцця, пакуль не з'ехалі вучыцца ў горад і не засталіся там. А вось ці часта мы, чуючы гэтае слова, думаем пра таленавітых людзей, якія жывуць там? Тыя, хто чуў, як співаюць на вяселлях у вёсцы альбо бачыў, як там калядуюць, пагодзяцца, што менавіта ў такіх месцах жыве натхненне. І вандруючы са здымачнай групай праекта «Наперад у мінулае» канала «Беларусь 3», кожны раз зноў і зноў пераконваюся ў гэтым.**



У вёсцы Дзятлавічы Лунінецкага раёна нас сустрэлі не толькі пазітыўныя людзі, але і выдатнае надвор'е, таму вырашылі зладзіць выступленне гурта «Вытокі» пад адкрытым небам. Нішто не замінала танцаваць, спяваць і размаўляць на свежым паветры. Пакуль удзельнікі калектыву збіраюцца, адны распяваюцца, іншыя прыносяць снапы, з якіх робіцца дэкарацыі для будучага выступлення. Назіраючы гэтае спалучэнне каласоў і народных строяў і слухаючы гармонік, міжволі хочацца падтанцоўваць і падпяваць.

...Першыя рэпетыцыі аўтэнтычнага гурта «Вытокі» адбыліся ў 2000 годзе, калі разам сабраліся аматары фальклору, якія жадалі захаваць сваю спадчыну. Цяпер жа тут ніводнае свята ўжо не абыходзіцца без іх выступленняў. З моманту ўтварэння і па сённяшні час калектыў узначальвае Мікалай Юр'евіч Яскевіч. Наогул у склад «Вытокаў» уваходзіць 8 таленавітых творчых людзей, якія жывуць мэтай дэманстраваць і захоўваць фальклор свайго народа — як у сцэнічным варыянце, так і ў народных абрадах. Свае ўменні ўдзельнікі гурта перадаюць сёння і маладому пакаленню.

Знаёмства з творчасцю калектыву пачынаецца з танца ойра. Танец гэты, як зазначыла адна з удзельніц, танцуецца вельмі «культурна», бо ў парах ніхто ні да каго не прыціскаецца шчыльна. Некалі ж тут танцавалі і кракавяк, каробачку, польку. І наогул, адпачывалі і працавалі заўсёды весела.

— Было ў нас у групе дванаццаць дзевак, і з імі хадзілі на вячоркі. Вышывалі і мухры вязалі, а хлопцы папрыходзяць — і танцы пачынаюцца, — дзеліцца ўспамінамі ўдзельніца калектыву Кацярына Кацуба.

А Надзею Кірылаўну Кацубу, якая з'яўляецца старэйшай у калектыве, тут называюць «энцыклапедыяй песеннага матэрыялу». Яна спявала з дзяцінства, а цяпер дзеліцца вопытам з іншымі. Нават маладыя, хоць у іх ужо і іншыя забавы ў наш час, цягнуцца да фальклору, часам проста распытваючы пра нешта.

Варта сказаць, што сама вёска Дзятлавічы з'яўляецца самай вялікай у раёне.

— Паселішча гэтае згадваецца з 1566 года. Але, безумоўна, яно існавала і раней, таму што ў той год было ўжо сорак двароў. А значыць, і раней тут людзі жылі. Дзятлавічы, можа, не так бы вызначыліся ў гісторыі, калі б не адзін з уладальнікаў, які на пачатку XVII стагоддзя стаў

**Танец гэты, як зазначыла адна з удзельніц, танцуецца вельмі «культурна», бо ў парах ніхто ні да каго не прыціскаецца шчыльна.**

Канстанцін Балмат. Ён быў праваслаўным, а праваслаўе ўжо тады праследавалася. Таму, не меўшы дзяцей, вырашыў перадаць свае вёскі — Лунінец, Мілясніцу і Дзятлавічы — манастыру. Дзятлавічы былі самым буйным паселішчам. Запрасіў манахаў Кіева-Пячэрскай лаўры, каб заснавалі тут манастыр. Манастыр быў вельмі багатым і вялікім. І называўся ён Новапячэрскі, альбо Дзятлавіцкі Праабражэнскі мужчынскі манастыр. У яго вельмі цікавая гісторыя, шмат адметных старонак барацьбы, таму што ў той час панаваў каталіцызм і, зразумела, былі і нейкія захопы з боку ўладальнікаў іншых паселішчаў, але манастыр трымаўся. Яшчэ неабходна было абавязкова ўтрымліваць за кошт манастыра і дапамагаць 12 вучням, 12 удовам і 12 сіротам. Там была бібліятэка, таму, можна лічыць, з Дзятлавіч наша асвета пачалася, бо манахі — пісьменныя людзі, — расказвае пра адметныя эпізоды з гісторыі вёскі краязнаўца Тацціяна Канапацкая. — Некаторыя з манахаў потым сталі настаўнікамі ў семінарыі.

Цяпер тут таксама спрыяльныя ўмовы для жыцця тых, хто любіць вёску і мае жаданне ў ёй застацца. Чыгуначная станцыя, прырода і зямля, дзе можна і працаваць, і жыць. Між іншым, як сказалі мясцовыя жыхары, сёння тут 60 дамоў знаходзіцца ў стадыі будаўніцтва. Жыццё працягваецца...

Аднак вернемся да песеннай спадчыны — каб зразумець яе, варта паслухаць нашых артыстаў. Яны ў самаробных строях — кашулі вышыты крыжыкам, а на спадніцах — амаль што вясёлкі з рознакаляровых стужак — спяваюць на фоне снапоў новага ўраджаю. І першая песня якраз у тэму:

*Да дай, Божа, цёплэ лето,*
*Дай будэ у полі жыто,*
*Щоб колосок похылывся,*
*Щоб колосок похылывся,*
*Сын мацеры поклонывся*
*Да на восень оженывся.*
*Узяв собы красну девку,*
*Узяв собы красну девку,*
*Ныбы розовую кветку.*
*Да дай, Божа, цёплэ лето,*
*Дай зароды в полі жыто.*

Атмасфера, скажу я вам, уражвае. Галасы гучаць і пераклікаюцца — як жаночыя, так і мужчынскія. Песні выконваюцца ў асноўным у двухгалосным варыянце з падгалоскам, што адпавядае традыцыйнай манеры выканання. Асноўнае месца ў рэпертуары займаюць старадаўнія палескія песні. А на канцэртных выступленнях «Вытокаў» можна пачуць яшчэ і байкі, і паэзію мясцовую... 16 лістапада 2012 года фальклорны гурт атрымаў званне «народны», і яго ўдзельнікі на справе апраўдваюць яго. Бо без іх не абыходзяцца многія мерапрыемствы, калектыў паважаюць не толькі ў роднай вёсцы, але і ў раёне, вобласці. Ён пабываў на шматлікіх конкурсах і фестывалях, сярод якіх — фестываль фальклору «Берагіня» (2004), міжнародны фальклорны фэст у Любліне — там за чатыры дні «Вытокі» далі 7 канцэртаў з рэпертуарам рознай тэматыкі, дзе ў аснове быў мясцовы вясельны абрад (2010). А сёлета калектыў удзельнічаў у міжнародным фальклорным фестывалі «Балтыка-2014». Дарэчы, калі гаварыць пра вяселле, то тут цікавы падыход да прыгатавання караваю. Калі яго выпякаюць, то таксама песні спяваюць. Печ распальваецца, цеста замешваецца, потым выпякаецца і ўпрыгожваецца каравай.

— У нас у каравай тыкаюць яловыя галінкі. Усяго іх павінна быць дзевяць. І гэтую «елку» ўпрыгожваюць кветкамі, потым абвязваюць стужкамі: чырвонымі альбо сінімі, у залежнасці ад таго, чый каравай: маладога ці маладой, — тлумачыць мясцовыя традыцыі Кацярына Кацуба. — І на вяселле завуць старых, каб тыя блаславілі.

Хочацца, каб гэта спрацоўвала ў жыцці і не атрымлівалася потым як у той песні...

*Людзі кажуць,*
*што мой муж добры,*
*Няхай будзе яму век доўгі.*
*Калінка-малінка мая,*
*Цвіла бела, стала розовая.*
*...А я яму ды бліной напяку,*
*А ён мяне галавой аб муку.*
*Калінка-малінка мая,*
*Цвіла бела, стала розовая.*
*А я яму ды пасцель пасцялю,*
*А ён мяне галавой аб сцяну.*
*Калінка-малінка мая,*
*Цвіла бела, стала розовая.*
*Людзі кажуць*
*што мой муж добры,*
*Няхай будзе яму век доўгі...*

«На чалавека ў жыцці ўплываюць найбольш два фактары — гены і людзі, сярод якіх ён жыве». Гэтая думка не новая, аднак пачутая з вуснаў аднаго мужчыны, што спявае ў гурце «Вытокі», яна не пакідае мяне і да сёння, калі ўспамінаю паездку ў Дзятлавічы. Таму што там ёсць калектыў, дзе людзі не толькі захавалі сваю культурную спадчыну ў песнях і абрадах, але і працягваюць перадаваць лепшае новым пакаленням. Нездарма ж кажуць — без мінулага няма будучыні.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота аўтара.**



# У ГОСЦІ ДА КОЛАСАВЫХ ЗЕМЛЯКОЎ

**Праект «Наперад у мінулае» зноў запрашае вас на чарговыя спатканні па нядзелях. Хочаце пачуць непаўторныя народныя песні? Даведацца, якімі традыцыямі жыве беларуская вёска? Тады не прапусціце новыя выпускі праграмы ў эфіры «Беларусь 3». 19 кастрычніка ў гледачоў будзе шанц пазнаёміцца з народным фальклорным калектывам «Коласавы землякі», пабываўшы ў вёсцы Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна. А 26 кастрычніка адбудзецца фальклорная экспедыцыя ў вёску Дзятлавічы, дзе пачуеце і пабачыце фальклорны гурт «Вытокі».**

Стаўбцоўшчына — цікавы рэгіён, які размяшчаецца на мяжы трох гісторыка-культурных рэгіёнаў — Цэнтральнай Беларусі, Панямоння і Палесся. Гэта суцэльна лясная зона. Тут паселішчы размяшчаліся толькі па берагах рэк. І сустракаюцца як малыя вёскі ў некалькі двароў, так і вялікія, што, безумоўна, паўплывала і на песенную культуру гэтага рэгіёна. І сёння на Стаўбцоўшчыне можна сустрэць і старажытныя песенныя жанры — каляндарна-абрадавыя, сямейна-абрадавыя песні, і больш нядаўнія спевы абрадавага цыкла. І нават цэлымі «звязкамі» — цікавыя прыпеўкі. Гэта раён Налібоцкай пушчы, раён вялікіх рэк, дзе сустракаюцца некалькі плыняў розных культурных пластоў беларускай традыцыйнай культуры. Раён мяжуе з Гродзеншчынай, і гэта таксама ўплывае на традыцыйную культуру мясцовасці, і ў мове гэтага раёна вельмі шмат акання, што не можа не адбіцца на стылі, — адзначае **этнограф Сяргей ВЫСКВАРКА.** — Паэтычна-вобразная мова строф песень таксама своеасаблівая. Яны даволі кароткія і вельмі чуллівыя. Стаўбцоўшчына — радзіма Якуба Коласа. І ў яго вершах таксама адбіваліся тыя строфы, якія гучалі ў народнай традыцыйнай культуры. Гэтую культуру трэба захоўваць у яе першасным выглядзе. Каб наступныя пакаленні маглі бачыць яе такой жа, якой можам бачыць і чуць мы сёння.

Аказаўшыся ў філіяле літаратурнага музея Я. Коласа «Смольня», дзе ў 1912 годзе адбылася першая сустрэча беларускіх класікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, зможаце пачуць любімую песню маці Коласа ў выкананні народнага фальклорнага калектыву «Коласавы землякі», даведацца пра традыцыі і песенную спадчыну гэтага рэгіёна. А ў выніку пачуеце арыгінальную версію адной з аўтэнтычных песень. Яе будзе выбіраць Вольга Плотнікава. **Таму не забудзьце ўключыць тэлеканал «Беларусь 3» 19 кастрычніка ў 11.10 альбо паглядзець паўтор праграмы 23 кастрычніка ў 15.30.**

**А ў нядзелю 26 кастрычніка ў той жа час** праект «Наперад у мінулае» зноў завітае на Палессе. І гледачы змогуць пабачыць і пачуць не толькі песні і танцы ў выкананні фальклорнага гурта «Вытокі», але і даведацца пра мясцовыя адметнасці ў абрадах, традыцыях. І, як заўсёды, пачуць, якой атрымаецца адна з народных песень у сучаснай апрацоўцы і ў выкананні гасцей праграмы — дуэта Лесі Кодуш і Вячаслава Нагорнага. А 30 кастрычніка ў 15.30 «Беларусь 3» пакажа вандроўку ў Дзятлавічы ў паўторным выпуску праграмы.

## АЎТОРАК, 21 КАСТРЫЧНІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.50** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.15** Зона Х.
**9.10, 21.45 Серыял «След».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Меладрама «Доўгі шлях дадому».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-2».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Такое звычайнае жыццё».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 1.25 Серыял «Маша ў законе!-2».**
**17.30** Беларуская часінка.
**19.20, 0.35** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**23.40** Вечар цяжкага дня.
**1.10** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**Пад Мінскам**, у параўнанні з Нью-Ёркам, шмат лясоў, дзе дазваляецца свабодна ездзіць на веласіпедзе. У ЗША зямля і лясы знаходзяцца ў прыватнай уласнасці. Выехаць на пешаходную зону — таксама табу. Так што ехаць на веласіпедзе можна толькі па дарогах у адным патоку з аўтамабілямі. Гэта некамфортна, таму даводзілася карыстацца метро. А ў Мінску ў грамадскі транспарт нават не заходжу.

**Канстытуцыя ЗША** гарантуе права народа на захоўванне і нашэнне зброі. Лепш, каб такое права, таксама як і права купіць лес, не меў ніхто.

**Вельмі хочацца** змяніць стаўленне да веласіпедаў у Беларусі. Каб людзі, асабліва якія жывуць у гарадах, зразумелі, што гэта звычайны сродак перамяшчэння. Па-першае, веласіпед вельмі карысны для здароўя і дапамагае трымаць сябе ў форме. Па-другое, гэта яшчэ і самы экалагічны від транспарту! Калі параўноўваць веласіпед і аўтамабіль, то веласіпед значна танней і купіць, і абслугоўваць. А самае галоўнае, добры настрой з самага ранку гарантаваны.



**Нядаўна вярнуўся з Фінляндыі**, дзе праходзіла веласіпедная канферэнцыя. Оўлу — проста казачны горад. Амаль палярны круг, і ўсе на веласіпедах: бабулі, школьнікі, мамы з дзеткамі. У Беларусі ж лічыцца, што зімой ездзіць на роварах нельга.

**Я езджу на веласіпедзе** круглы год. У галалёд мне пешшу нават больш слізка, чым на веласіпедзе з шыпаванымі шынамі. А сёлета набыў сабе на зіму фэтбайк. Гэты веласіпед адрозніваецца ад звычайнага шырынёй колаў (яны больш тоўстыя) і, вядома, коштам. Такі своеасаблівы матацыкл, але без рухавіка.

**Калі ў мароз еду** міма аўтобуснага прыпынку, людзі, захутаныя ў кажухі і пухавікі, думаюць: вось чаргова вар'ят паехаў. Але я, у адрозненне ад іх, знаходжуся пастаянна ў руху. Акрамя таго, на мне двое двухслойных рукавіц, каб не мерзлі кончыкі пальцаў, двухслойная шапачка, дзве пары ваўняных шкарпэтак, набытых у беларускі бабуль. Цяплейшых я ў крамах не знаходзіў! На зіму наўмысна набываю абутак на два тры памеры большы. І ў 20-градусны мароз выдатна сябе адчуваю.

### ПРА КАНТЭЙНЕР З РЭЧАМІ, ПЛАТНЫЯ ПАРКОЎКІ І «ВЕЛАКУХНЮ»

**Ёсць думка**, што веласіпедам карыстаюцца тыя, у каго не хапіла грошай на аўтамабіль. Насамрэч жа сярод веласіпедыстаў у Мінску даволі шмат праграмістаў (і я адзін з іх), якія зарабляюць нядрэнныя грошы. У Еўропе ж на роварах ездзяць нават мэры буйных гарадоў і міністры. Таму гэта прагрэсіўнасць, а не адсталасць.

**Не хачу сказаць**, што машына — гэта дрэнна ці добра. Яна інструмент. Карысны і патрэбны. Але, лічу, паркоўка ў гарадах павінна быць платнай. Так ва ўсім свеце. Як гэта абсурдна ні гучыць, але сёння адзіны аб'ект, які мае права бясплатна манапалізаваць двор — гэта аўтамабіль. Калі я пастаўлю ў двары кантэйнер і буду захоўваць там свае рэчы, то жыхары справядліва абурацца. А вось калі ў тым жа месцы прыпаркаваць аўтамабіль і запоўніць рэчамі, то ніхто і слова не скажа. Хоць у чым розніца? Па-мойму, выкарыстоўваць грамадскія землі як склад няправільна...

**Я мог**, вядома, пераехаць жыць у Швецыю, Данію, Галандыю або Германію. Там для веласіпедыстаў створаны ўсе ўмовы. Але мне падабаецца ўдзельнічаць у стварэнні інфраструктуры, а не проста прыехаць на ўсё гатовенькае і карыстацца. Мінск толькі ў самым пачатку веларуху, тут ёсць патэнцыял для развіцця.

**Летась разам з аднадумцамі**, актывістамі Мінскага веласіпеднага таварыства, адкрылі ў Мінску «Велакухню». Сюды можа прыехаць любы веласіпедыст і бясплатна, сваімі рукамі ці пры дапамозе валанцёра, адрамантаваць свайго жалезнага каня. Што мяне здзівіла і парадавала — дык тое, што адкрыць сваю справу ў Беларусі зусім не складана.

### ПРА ЖЭРАРА ДЭПАРДЗЬЕ, КАХАННЕ І ТЭЛЕВІЗАР

**Я адмовіўся** ад амерыканскага грамадзянства, каб атрымаць беларускае. Прыйшоў у пасольства і напісаў заяву. Там здзівіліся, але паставіліся дружалюбна. Звычайна ад грамадзянства адмаўляюцца, каб пазбегнуць падаткаў, як, напрыклад, французскі акцёр Жэрар Дэпардзье. Мне ж было няёмка жыць тут як амерыканец, таму што палітыка ЗША ў дачыненні Беларусі мне ў многім не падабаецца.

**Пачаў вучыць** беларускую мову, бо жыву ў Беларусі. Кожны дзень стараюся запомніць адно новае слова. Поспехі пакуль не бліскучыя, але я стараюся.

**«Каханне»** — маё самае любімае слова. Цікава, што такое важнае паняцце можна дакладна выказаць толькі па-беларуску. Па-англійску, па-руску гэтаму пачуццю няма адпаведнікаў.

**У дзяцінстве** я жыў з бацькамі і, як ва ўсіх амерыканскіх сем'ях, у нас былі аўтамабілі і тэлевізары. Але, як толькі я стаў жыць асобна, вырашыў адмовіцца ад тэхналогій, якія мне не патрэбны. Не, я нічога не маю супраць тэлевізара. Проста я не хачу з ім жыць (*усміхаецца*).

**Я не карыстаюся мабільнікам**, бо жыццё без мабільніка больш спакойнае і мэтанакіраванае. Магчыма, нехта скажа, што гэта нязручна. Затое нашу размову ніхто беспардонна не можа перапыніць. Я карыстаюся электроннай поштай, і мне гэтага хапае. Раней не было тэлефонаў. Усе ведалі, што нельга спазняцца, бо чалавек чакае. А цяпер можна патэлефанаваць і ўсё адмяніць. Я не люблю прымушаць людзей чакаць.

**Надзея ДРЫЛА,**
**фота Тацццяны РУСАКОВІЧ**



### БЛІЦ-АПЫТАНКА

***— Тры словы, з якімі ў вас асацыюецца Беларусь?***

— Другая радзіма і памяркоўнасць. Некаторыя лічаць памяркоўнасць адмоўнай рысай характару, але мне яна вельмі падабаецца. Цярплівасць, жаданне знайсці мірнае рашэнне — гэта якасці, якія характэрны беларусам і якія я імкнуся развіваць у сабе.

***— Якія якасці цэніце ў людзях?***

— Розум, нестандартнасць, экалагічнасць. Мне блізкія па духу людзі, не зацыкленыя на спажыванні, у якіх матэрыяльныя каштоўнасці далёка не на першым месцы.

***— А ў жанчынах?***

— Тыя ж. У Беларусі вельмі шмат стройных жанчын. Нярэдка гэта вынік строгага харчавання, дыет. А ёсць тыя, якія ядуць, што хочуць і калі хочуць, але пры гэтым вельмі актыўныя. Як па мне, дык другія больш прывабныя. Калі відаць, што чалавек шмат часу, грошай і энергіі марнуе на ўпрыгажэнні, касметыку, адзенне, я гэтага не разумею. Але ж кожны чалавек сам вырашае, што для яго мае сэнс, а што не.

***— Падзяліцеся запаветнай марай?***

— Мару пра сям'ю і дзяцей. Звычайна гэта робіцца ў больш маладым узросце. Але я даўно зразумеў, што ажаніцца з амерыканкай — значыць застацца жыць у Амерыцы. Прывезці жонку з Амерыкі ў Беларусь — амаль нерэальна, а таму і не спяшаюся. Можа, і ёсць дзяўчына ў Амерыцы, якая б згадзілася, але я яе, на жаль, не сустрэў... Калі ж жыў у Расіі, было адчуванне, што я яшчэ не знайшоў месца, дзе хачу жыць пастаянна. Маленькія ж дзеці патрабуюць стабільнасці...

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ по продаже права заключения договора аренды помещений транспортного республиканского унитарного предприятия «Брестское отделение Белорусской железной дороги»

| № лота | 1 |
|---|---|
| Наименование, местонахождение и характеристика объекта | право заключения договора аренды отдельных помещений, в т.ч.: **помещение № 1** общей площадью 1001,2 кв.м (Характеристика: имеются – естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление, водоснабжение и водоотведение, лифты, телефонизация) в подвале, на 1-м, 2-м и 3-м этажах здания вокзала (инв. № 100/С-47089) по ул. Кижеватова, 1Б/1 в г. Бресте; **помещение № 2** общей площадью 550,3 кв.м (Характеристика: имеются – естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление, водоснабжение и водоотведение, телефонизация) на 1-м этаже здания багажного отделения (старого) (инв. № 100/С-47084) на пл. Привокзальная, 2А в г. Бресте; **помещение № 3** общей площадью 17,0 кв.м (Характеристика: имеются – естественное освещение, электроснабжение) в двух павильонах выхода – составной части и принадлежности здания багажного отделения (старого) (инв. № 100/С-47084) на пл. Привокзальная, 2А в г. Бресте |
| Балансодержатель | Вокзал станции Брест-Центральный транспортного республиканского унитарного предприятия «Брестское отделение Белорусской железной дороги» |
| Начальная цена (руб.) | **9 863 076** |
| Сумма задатка (руб.) | 986 000 |
| Срок аренды | 5 лет |
| Ставка арендной платы либо размер коэффициента к базовой ставке арендной платы | за помещения № 1 и № 2 – 1163,625 базовой арендной величины; за помещение № 3 – 12 817 949 руб. (125,666 базовой арендной величины) |
| Условия оплаты | разовый платеж |
| Размер штрафа, руб. | 15 000 000 |
| Условия продажи | для оказания услуг розничной торговли и общественного питания, трудоустройство штата в количестве 60 человек, аренда оборудования в количестве 112 единиц и инвентаря в количестве 810 номенклатурных позиций (сумма арендной платы в месяц 209 369 758 рублей), запрет на продажу алкоголя после 22.00 |
| Организатор аукционных торгов | **КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»** |

**ПРИМЕЧАНИЕ:**

Для участия в аукционе юридических или физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей, прилагаются к заявлению, подаваемому:

1. юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь:
копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
2. юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь:
легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;
копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
3. индивидуальным предпринимателем:
копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;
копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
4. физическим лицом – копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются:
представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя;
физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, ул. Московская, 202, код банка 246, УНП 290433924.

Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. №1049.

Право заключения договора аренды возникает у победителя аукциона с момента внесения им определенной в ходе аукционных торгов цены за право аренды нежилого помещения. Данная сумма должна быть внесена победителем в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор аренды должен быть подписан в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Победитель аукциона обязан оплатить организатору аукциона в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов** сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

**Аукцион состоится 18 ноября 2014 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 17.10.2014 г. до 17.30 12.11.2014 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**
**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**
**Сайты: www.bgcn.by, www.brest-region.gov.by, www.gki.gov.by**

## Вниманию акционеров ОАО «Белгорхимпром»!

**Внеочередное общее собрание акционеров состоится 31 октября 2014 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17 в актовом зале.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об утверждении годовой бухгалтерской отчетности за 2013 год.
2. Об утверждении распределения прибыли и выплате дивидендов.

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Киселева, 26а, каб. № 407) в рабочие дни в период с 20 по 30 октября 2014 г. с 13.00 до 15.30, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Акционерам, передавшим на основании доверенности свои полномочия на участие в общем собрании членам наблюдательного совета, участие в собрании не обязательно.

Регистрация акционеров (их представителей), имеющих право на участие в собрании, – в день проведения собрания с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале (3 этаж). При себе иметь следующие документы: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 600024712

**Уважаемые акционеры открытого акционерного общества**

## «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск»

**30 октября 2014 года в 15.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск». Собрание пройдет по адресу Общества: г. Витебск, ул. Суворова, 16, актовый зал.**

**Повестка дня собрания:**

1. О выплате дивидендов за 9 месяцев 2014 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16 (наблюдательный совет), с 24 по 29 октября 2014 г. (время работы с 8.30 до 17.30), либо 30 октября 2014 года по месту проведения собрания, тел. 37 45 66.

**Регистрация участников собрания с 14.00 до 14.45 по месту проведения собрания.**

Реестр владельцев ценных бумаг и список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров будет составлен по состоянию на 20 октября 2014 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 300000398

**Наблюдательный совет**

белагропромбанк
традиции будущего

# БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 1 октября 2014 г.
### ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 906 285 | 880 319 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 7 065 | 7 970 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 5 019 633 | 2 132 700 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 592 399 | 446 652 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 10 163 466 | 6 333 022 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 51 246 858 | 47 235 482 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 1 217 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 788 288 | 730 716 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 2 247 687 | 1 813 500 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 811 | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 723 557 | 545 510 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | | 71 697 266 | 60 125 871 |
| **15** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | 2 809 467 | 977 722 |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 7 393 576 | 8 825 921 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 43 672 645 | 33 283 316 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 5 858 217 | 6 430 015 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | 1 206 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 419 690 | 648 070 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 60 153 595 | 50 166 250 |
| **24** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 6 803 635 | 6 603 635 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 934 879 | 506 659 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 1 399 067 | 1 105 595 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 2 406 090 | 1 743 732 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 11 543 671 | 9 959 621 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 71 697 266 | 60 125 871 |

# ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## за январь – сентябрь 2014 года
### ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 7 077 074 | 7 093 739 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 5 401 256 | 5 170 754 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 1 675 818 | 1 922 985 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 818 095 | 767 797 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 171 863 | 168 187 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 646 232 | 599 610 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 215 | 601 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (4 978) | 6 772 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 315 619 | 218 289 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 6 221 | (24 436) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 405 042 | 734 031 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 805 279 | 424 122 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 1 688 688 | 1 292 989 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 197 802 | 206 175 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 1 152 874 | 914 748 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 239 088 | 299 612 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 913 786 | 615 136 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | - | - |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

**Председатель Правления** **А.А. Лысюк**

**Главный бухгалтер** **М.А. Шаповалова**

**Дата подписания «6» октября 2014 г.**

**http://belapb.by/rus/about/bank-activity/indexes/individualnaya-otchetnost-po-nacionalnym-standartam/quarterly-reporting/date_october/**

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00 - 20.00 - рабочие дни
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

BELARUS
ГЕНЕРАЛЬНЫЙ СПОНСОР НАЦИОНАЛЬНОГО ОЛИМПИЙСКОГО КОМИТЕТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
на период 01.08.2013-31.07.2017

TÜV International Certification TÜV THÜRINGEN CERT ISO 9001 15 100 38597 TIC

**www.belapb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 от 26 мая 2014 года выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

## РУП «Белпочта»

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ ПО ВЫБОРУ СПЕЦИАЛИЗИРОВАННОЙ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ ДЛЯ ВЫПОЛНЕНИЯ ИЗЫСКАТЕЛЬСКИХ РАБОТ на объекте «Обследование технического состояния строительных конструкций отделения почтовой связи №120 по ул. Казинца, 120-428 в г. Минске».**

Процедура переговоров состоится **«21» октября 2014 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.**

Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства – тел. 293-55-29, 293-55-28.

УНП 101015738

**Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей уведомляет о внесении изменения в извещение о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Торфобрикетный завод Ошмянский»,** *опубликованное в газете «Звязда» от 08.10.2014 года:* кадастровый номер земельного участка 424982406601000163 **ИЗМЕНЕН НА 424982400001000023. Тел. 8(0152)744911.**

УНП 500481906

*Уважаемые акционеры ОАО «Мостоотряд №88»*

**29 октября 2014 года состоится внеочередное общее собрание акционеров**

## ОАО «Мостоотряд №88»

**Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д. 16, третий этаж, актовый зал.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

*1. О выплате дивидендов за 3 квартал 2014 года.*

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по указанному выше адресу в рабочие дни с 22 октября 2014 г. с 13.00 до 16.45 по месту нахождения Общества у председателя наблюдательного совета, а в день собрания – в помещении, где оно будет проводиться – в актовом зале в здании управления на третьем этаже.

Регистрация участников собрания с **15.30** до **15.55** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 29 октября 2014 года в 16.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 21 октября 2014 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

***Наблюдательный совет***

УНП 100299744

■ Наша марка

# АРЫЕНТАЦЫЯ НА РОЗНІЦУ

**Сёння магутнае беларускае прадпрыемства «Мілавіца» не мае патрэбы ў рэгіянальных складах для захавання гатовай прадукцыі.**

Шлях да пакупніка стаў больш кароткім. А значыць, пакупніку не трэба і аплачваць лішнія затраты. Усё гэта стала магчымым дзякуючы лагістычнаму цэнтру «Мілавіца-лагістык», створанаму СП ЗАТ «Мілавіца» сумесна з «Silvano Fashion Group» пад Мінскам. У верасні цэнтр выйшаў на планавую магутнасць: новая структура, якая запатрабавала 5 млн еўра, дазваляе адгружаць звыш 30 млн вырабаў у год.

«Галоўнае цяпер — павысіць прыбытковасць, захаваць заваяваныя пазіцыі і рухацца далей — на тыя рынкі, дзе вырабаў «Мілавіцы» пакуль няма», — зазначае **старшыня праўлення «Silvano Fashion Group» Мэрт МЭРЫЦ**.

Раней транспартна-лагістычная сістэма прадпрыемства ўключала пяць складскіх памяшканняў, размешчаных у розных кропках краіны, што ўскладняла працэс дастаўкі, збору і адгрузкі заказаў, павялічвала транспартныя расходы. Высокатэхналагічны праект «Мілавіца-лагістык», распрацаваны разам з адной аўстрыйскай кампаніяй, — гэта 10 тысяч кв. метраў плошчы, разлічанай на гадавы аб'ём вытворчасці.

— Наша прадукцыя праходзіць тут дасканалы кантроль якасці, — расказвае **тэхнічны дырэктар СП ЗАТ «Мілавіца» Алена ТКАЧЭНКА.** — Кожны з латкоў, у якім знаходзіцца ад 60 да 80 адзінак вырабаў, праходзіць інспекцыю, што максімальна выключае магчымасць адправіць на склад няякасны тавар. Прадукты неналежнай якасці, з дэфектамі, трапляюць у зону каранціну, дзе спецыяліст вырашае: вярнуць іх на перапрацоўку або ўтылізаваць... У шасці цэнтрах упакоўкі — ручной і машыннай — тавар пакуецца па адной-дзве-тры і пяць адзінак. Упакоўка ажыццяўляецца такім чынам, каб бюстгальтары даязджалі да гандлёвай кропкі не пакамечанымі... Складская сістэма лагістычнага цэнтра — гэта 63 тысячы ячэек. У кожнай ячэйцы — 35-40 адзінак тавару. Усё гэта дазваляе фарміраваць партыі любога аб'ёму і асартыменту з высокай хуткасцю. Мы атрымалі магчымасць камплектаваць заказы для кожнага канкрэтнага магазіна ў любой кропцы свету...

Сёння брэнд «Мілавіца» — адзін з самых вядомых у Беларусі. У блізказамежных краінах фіксуюцца нават спробы падробак і падпольнага вырабу. Аднак кіраўніцтва больш заклапочана іншымі абставінамі. «Мілавіца» была і застаецца арыентаванай на экспарт. І асноўны экспартны рынак знаходзіцца ў Расіі, куды накіроўваецца 80 працэнтаў прадукцыі. «У пачатку года ў нас былі пэўныя рознагалоссі з расійскімі партнёрамі, якія патрабавалі зніжэння цэн, — тлумачыць **генеральны дырэктар СП ЗАТ «Мілавіца» Нормундс ОЗАЛІНШ.** — Мы вытрымалі націск, але расійскі рынак скараціўся для нас на 19 працэнтаў. Гэта адбылося па аб'ектыўных эканамічных прычынах. Наша задача — шукаць новыя рынкі, і мы іх шукаем».

З пачатку года завод ужо заключыў дамоўленасці з новымі партнёрамі ў ЗША, Чэхіі, Ізраілі, В'етнаме, Ірландыі. Падпісана і 19 новых дагавораў з расійскімі партнёрамі. Аб'ём рэалізаванай прадукцыі ў першым паўгоддзі склаў амаль 9 млн адзінак прадукцыі, што ў фінансавым выражэнні складае больш за 40 млн еўра.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

## Па чутках і кампетэнтна

**Тэхнічны дырэктар СП ЗАТ «Мілавіца» Алена ТКАЧЭНКА** развеяла міф наконт таго, што ў замежжа «Мілавіца» пастаўляе больш якасны і прывабны тавар:

— Дваццаць беларускіх прадпрыемстваў шыюць нашы вырабы. Швачкі не ведаюць, на які рынак пойдзе будучы тавар. Тым больш цяпер гатовыя вырабы паступаюць спачатку ў лагістычны цэнтр, адкуль і накіроўваюцца ў гандлёвыя кропкі. Заказчык як унутры краіны, так і за яе межамі арыентуецца на попыт спажыўца. А ў кліентаў розных краін і гарадоў сапраўды могуць быць розныя перавагі.

***— Кажуць, што «Мілавіца» будзе выкарыстоўваць сыравіну і кітайскага паходжання?***

— Мы надзвычай рэдка выкарыстоўваем сыравіну азіяцкіх краін. У Беларусі набываем баваўняныя палотны, штосьці з фурнітуры. Але нашымі асноўнымі пастаўшчыкамі палотнаў былі і застаюцца Італія, Латвія і Аўстрыя. Нагогул гістарычна склалася так, што Латвія была асноўным пастаўшчыком эластычнага палатна для «Мілавіцы». Сыравіна складае ў сабекошце прадукту каля 60 працэнтаў, а значыць, выраблены з дарагой сыравіны тавар не можа быць танным. Дарэчы, у нашай краіне цэны на прадукцыю «Мілавіцы» застаюцца самымі нізкімі.

■ Май на ўвазе

# НА ДАРОЗЕ Ў РЫГУ МОЖНА СЭКАНОМІЦЬ

**Спецыяльныя тарыфныя планы з 1 лістапада распаўсюдзяцца і на перавозку пасажыраў цягніком № 87/88 Мінск — Рыга, паведамілі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі.**

Напрыклад, цяпер кошт праезду ў ім у плацкартным вагоне на небакавым месцы складае 456 200 рублёў. У выпадку аплаты праезду ад 31 сутак і больш да адпраўлення цягніка кошт праезду са зніжкай 15 працэнтаў складзе 389 500 рублёў.

Пры афармленні праязных дакументаў на гэты цягнік у перыяд ад 20 да 11 сутак да адпраўлення будзе выкарыстоўвацца дзейны тарыф; пры афармленні білетаў за 10 сутак і менш да адпраўлення ўстанаўліваецца 5-працэнтная надбаўка да агульнага кошту праезду.

Спецыяльныя тарыфныя ўмовы прымяняюцца пры праездзе ў міжнародных зносінах паміж Беларуссю і Літвой і не дзейнічаюць пры афармленні праязных дакументаў у межах Беларусі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

## Информация о проведении открытого аукциона 2 лотами по продаже недвижимого имущества: здание склада и здание административно-хозяйственное

| | |
|---|---|
| **Адрес объектов и их наименование:** | Здание склада (инв. № 645/С-6624), 520,6 кв.м, расположенное по адресу: Минская обл., г. Старые Дороги, ул. Колхозная, 33. Снижена первоначальная цена продажи имущества на 25%, что составляет – 221 400 000 (двести двадцать один миллион четыреста тысяч) белорусских рублей (с учетом НДС 20%).<br>Здание административно-хозяйственное (инв. № 640/С-61959), 1447,8 кв.м, расположенное по адресу: Минская обл., г. Слуцк, ул. Транспортная, 1. Снижена первоначальная цена продажи имущества на 25%, что составляет – 2 622 256 200 (два миллиарда шестьсот двадцать два миллиона двести пятьдесят шесть тысяч двести) белорусских рублей (с учетом НДС 20%). |
| **Продавец:** | ОАО «Миноблавтотранс» Филиал «Автобусный парк № 2» |
| **Порядок оплаты:** | Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона и публикацией объявления в СМИ. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 30-ти банковских дней со дня проведения аукциона. |
| **Сумма задатка:** | 10% от начальной цены объекта (лота) с учетом (НДС) на р/с 3012462470015 в РКЦ № 42 филиала ОАО «Белагропромбанк» – Минское областное управление, код 942, г. Слуцк, ул. Копыльская, 7, УНП 601070249, ОКПО 031217156014.<br>Получатель: Филиал «Автобусный парк № 2» |
| **Организатор аукциона:** | ОАО «Миноблавтотранс» Филиал «Автобусный парк № 2»,<br>223610, Минская обл., г. Слуцк, ул. Транспортная, 4 |
| **Документы, предоставляемые для участия в аукционе:** | Копия платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка в размере 10% от начальной цены объекта (лота) (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Задаток 10% от начальной цены объекта согласно Условиям проведения аукциона с НДС.»)<br>Дополнительная информация о документах размещена на сайте<br>**www.minoblavtotrans.by (раздел «Новости»)** |
| **Конечный срок и адрес приема заявок:** | **20.11.2014 г. до 16.00, Минская обл., г. Слуцк, ул. Транспортная, 4<br>Филиал «Автобусный парк № 2»,<br>тел. 8-0179545085, факс 801795 46477, тел. 8017 294 13 95** |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** | **21.11.2014 г. в 10.00, Минская обл., г. Слуцк, ул. Транспортная, 4** |

**РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ ОБ ОТМЕНЕ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «БРЕСТЛИФТ», НАЗНАЧЕННЫХ НА 21 ОКТЯБРЯ 2014 ГОДА, ОПУБЛИКОВАННЫХ В ГАЗЕТЕ «ЗВЯЗДА» № 177(27787) ОТ 18 СЕНТЯБРЯ 2014 ГОДА.**
**Контактный тел.: 8 029 626 72 52; 8 0162 23 92 59.**
УНП 102353509

УНН 600038919
**ОАО «Світанак» г. Жодино**
**ПРИГЛАШАЕТ ОРГАНИЗАЦИИ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ**
**на выполнение электротехнических измерений и испытаний электрооборудования на объектах ОАО «Світанак» г. Жодино.**
Заявки принимаются по адресу: г. Жодино, ул. 8 Марта, 1 до 11.00 27.10.2014 г.
За дополнительной информацией обращаться по тел.: 8(01775) 7-14-92, 7-97-74.

**Закрытое акционерное общество**

## «ДЕЛЬТА БАНК»

ДЕЛЬТА БАНК

220036, г. Минск, ул. Розы Люксембург, 95.
Тел. 256 19 08, www.deltabank.by

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2014 г.

Наименование банка: Закрытое акционерное общество «Дельта Банк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2014 | 01.10.2013 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 126 178 | 79 636 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 357 714 | 97 189 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 352 658 | 408 071 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 430 414 | 218 878 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 2 058 352 | 1 159 011 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 11 096 | 12 298 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 1 156 | 1 156 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 174 786 | 36 957 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | 618 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 94 929 | 183 169 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 3 607 283 | 2 196 983 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 25 058 | 29 506 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 390 694 | 396 538 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 2 659 538 | 1 307 404 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 69 966 | 19 942 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 5 515 | 6 115 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 28 100 | 40 529 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 3 178 871 | 1 800 034 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 261 380 | 261 380 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 20 333 | 17 942 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 34 649 | 18 556 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 112 050 | 99 071 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 428 412 | 396 949 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 3 607 283 | 2 196 983 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2014 г.

Наименование банка: Закрытое акционерное общество «Дельта Банк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2014 | 01.10.2013 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 586 841 | 228 690 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 492 647 | 242 252 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 94 194 | (13 562) |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 166 152 | 267 605 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 16 629 | 13 988 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 149 523 | 253 617 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (1 277) | 15 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 10 922 | 6 124 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (1 041) | (405) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 89 424 | 47 926 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 53 946 | 54 398 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 173 495 | 122 391 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 12 795 | 7 496 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 30 553 | 122 374 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 1 252 | 18 622 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 29 301 | 103 752 |

**И.о.Председателя Правления** **Сысоев Д.В.**

**Главный бухгалтер** **Грибанова Е.М.**

**Дата подписания «07» октября 2014 г.**

*Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 27 от 26.04.2013 г. УНП 807000015*

■ Персона

## Саша ВАРЛАМАЎ:

# «МОДА — УНІКАЛЬНЫ СПОСАБ УЦЁКУ АД РЭАЛЬНАГА ЖЫЦЦЯ»

### Вядомы дызайнер пра тое, як не паддацца «глянцу» і знайсці ўласны стыль

**Яго імя — гэта брэнд, у яго асобе вызначальнымі з'яўляюцца прафесіяналізм і філасофскае стаўленне да жыцця. Ён вядомы дызайнер, да якога і сёння ідуць з заказамі. Аўтар шэрагу кніг пра моду, для якога яна з'яўляецца сапраўдным мастацтвам. З 2013 года Варламаў з'яўляецца прадстаўніком у Рэспубліцы Беларусь міжнароднага конкурсу маладых дызайнераў «Пакаленне NEXT», дзе выступае з лекцыямі і ўваходзіць у склад журы. А не так даўно пачаў сваё жыццё яшчэ адзін яго праект — «Тэатр моды «Шафа». Як з'явілася новая пляцоўка для юных творцаў, хто дыктуе моду сёння і ці ёсць нешта вышэйшае за стыль, мы высветлілі падчас гутаркі з маэстра.**



***— Саша, раскажыце пра ўзнікненне праекта «Тэатр моды «Шафа»...***

— Усё атрымліваецца само па сабе. Мабыць, ніколі не было такога, каб я галавой прабіваў сцяну. У нейкі момант з'яўляецца цікавая думка, калі яна вяртаецца зноў і зноў, то спачатку спрабую адмахнуцца, але ў выніку разумею: пакуль задуманае не здзейсню — яна не знікне. І вось варта толькі прыняць рашэнне, што будзеш гэтым займацца — і зоркі складваюцца, як трэба, і ўсё атрымліваецца само па сабе. А мне трэба толькіназіраць, каб не збіцца з дарогі, бо ў кожнага руху ёсць заўсёды мэта. Калі чалавек ідзе па вуліцы, то вельмі шмат спакус навокал — кіно, тэатр, крамы, кавярні, і можна ў любым месцы спыніцца і заняцца іншай справай. Але тады ёсць рызыка згубіць свой курс.

У выпадку з гэтым праектам я проста ведаю: ён патрэбен. Мне патрэбен для таго, каб жыць. Зарабляць гэтым я ніколі асабліва і не зарабляў, таму жыву дастаткова сціпла. Але ў жыцці было месца сітуацыям, калі людзі былі цікавымі, а сустрэчы патрэбнымі, не ў тым сэнсе, што даюць грошы, а калі з'яўляецца чалавек, з якім вам па дарозе. Так і Тэатр моды «Шафа» вырас.

Гэты праект пачаўся яшчэ ў 1981 годзе, калі быў Мінскі тэатр моды. Толькі адкрыўся Дом модаў нумар два. І ўсё гэта складвалася. Таму як бы ні было складана, калі не губляеш свой арыенцір, то дойдзеш да патрэбнага пункта. А не атрымліваецца — значыць, не тваё, чужое.

***— Як набіраюць дзяцей у Тэатр моды? Чым яны займаюцца?***

— У нас праходзяць заняткі па маляванні, модзе і мадэлінгу. Мода — гэта ўсё, звязанае са стварэннем таго, што будзе паказвацца на сцэне. Мадэлінг — дэманстрацыя створанага: тут і слова, і музыка, і харэаграфія, і рэжысура. На паказе заўсёды відаць, як паставіўся да раскрыцця ідэі аўтар, наколькі зразумеў яе. Таму што мода, як і іншы від мастацтва, можа раскрыць абсалютна любы сэнс, данесці любую думку, калі там не будзе проста капіравання, а будзе трансфармацыя, пераасэнсаванне. Прычым гэта магчыма зрабіць з дапамогай кішэнькі, вытачкі, сілуэта. Мастацтва гаворыць пра сутнасць любові, усё ў свеце створана і ствараецца для любові. А словы — наогул вельмі абмежаваны спосаб выказваць свае эмоцыі.

Дзеці прыходзяць да нас як дадому, дзе могуць займацца творчасцю. Ёсць малодшая і старэйшая групы. Мы працуем над адной вельмі цікавай тэмай — «Планета Пудзіла». Яна па сваім змесце ў нас фундаментальная, бо фарміруе ў дзяцей здольнасць ствараць сусветы, думкі ва ўмовах, дзе ўсё падпарадкоўваецца ідэі і духу. А наогул, калі няма духу — то няма нічога. Людзі, якія кажуць, што трэба жыць у матэрыяльным свеце і ставіць матэрыяльныя каштоўнасці на першае месца, ніколі не тварылі. На «Планеце Пудзіла» чалавек прывучае сябе да таго, што няма патрэбы нешта разбураць. Там дзеці самі прыдумляюць правілы, і галоўнае з іх — жыць.

***— Не думалі пра тое, каб дзяліцца вопытам з дзецьмі і з іншых гарадоў?***

— Калі нас паклічуць, то з задавальненнем паедзем. Мы гатовы дзяліцца вопытам і адкрыты для супрацоўніцтва. Адзінае, чаго не хацелася б — каб нас ператварылі ў праект дзеля галачкі ці статыстыкі.

***— Вы з'яўляецеся аўтарам «Млына моды». Маглі б параўнаць тое, што было пры вас, і што маем сёння?***

— Я аўтар таго «Млына моды», які існаваў дваццаць гадоў да 2011-га. Цяпер, на мой погляд, усё робіцца дзеля справаздачы. Калі б такое адбывалася пры мне, то не было б маладых дызайнераў, якіх мы ведаем. Цяперашні конкурс практычна не служыць маладым. Напрыклад, там патрабаванні — адзенне павінна быць pret-a-porte. А які вопыт у 18-гадовых, каб патрабаваць такое? Альбо іншая сітуацыя: я бачу на подыуме шэдэўры мастацтва ў дызайнера, і так — амаль цераз аднаго канкурсанта. Пытанне, як вызначыць лепшага? Тут не спорт, дзе трэба трапіць на фініш першым. І ці можна суб'ектыўныя ацэнкі журы выдаваць за аб'ектыўныя? Галоўнае журы ў модзе — гэта калі тваё адзенне носяць людзі на вуліцы, калі кліенты да цябе стаяць у чарзе на некалькі месяцаў наперад. Тут, як у музыцы: маеш поўную залу на канцэрце — і неабавязкова быць нейкім там лаўрэатам.

***— А што вы думаеце пра дзіцячыя конкурсы прыгажосці?***

— Я яшчэ магу зразумець конкурсы прыгажосці для дарослых, дзе дзяўчат ацэньваюць з пазіцыі прывабнасці. Бо на падсвядомасці прывабны вобраз вядзе да прадаўжэння роду. А па якім прынцыпе ацэньваюць дзяцей? Па прыгажосці чаго? У гэтым няма ніякага сэнсу. Так толькі нараджаецца мара нічога не рабіць і не вучыцца. І, праўда, навошта, калі ўсе табе апладзіруюць і ўсё само валіцца да ног? Альбо іншы прыклад: у шэсць гадоў дзіця выклікае проста замілаванне, а потым тая дзяўчынка расце, змяняюцца прапорцыі цела, і як тут успрымаць перамены, калі ў галаве закладзена, што ты ідэальная?

***— Неяк вы напісалі «Мода па сваёй сутнасці — унікальны спосаб уцёку ад рэальнага жыцця»...***

— Мода — яна ідэальная і духоўная. У якасці першапачатковага матэрыялу бярэцца тканіна, а ў выніку мы атрымліваем вобраз, які немагчыма «пралічыць». Мода з'яўляецца па сутнасці сваёй менавіта ідэяй, вобразам. Яна не мае ніякага дачынення да простага адзення, якое мы надзяваем, каб абараніць сваё цела.

***— Глянцавыя часопісы могуць дыктаваць моду?***

— Не, таму што такія часопісы рэкламуюць тавар, які трэба прадаць абывацелю без уласнай думкі. Глянцавыя часопісы фарміруюць пэўную прастору, напаўняюць яе незразумелымі словамі і прадметамі, а потым тыя, хто не ўпісваецца ў гэтую ідэальную карцінку, застаюцца быццам бы «за бортам».

***— Тады дзе б параілі шукаць падказкі тым, хто яшчэ не вызначыўся з уяўленнямі пра ўласны стыль?***

— У тэатры, кіно, у музыцы, у іншых відах мастацтва. І гэта не будзе капіраваннем, таму што, гледзячы на чыюсьці цудоўную працу, мы адкрываем для сябе прыгажосць, пачынаем глядзець на свет усё больш адкрыта.

***— Як казала Како Шанель: «Мода праходзіць, а стыль застаецца»...***

— Густ застаецца! І гэта не тое самае, што і стыль, а больш высокае паняцце. Калі ты можаш у адным вобразе спалучаць розныя стылі, то гэта і ёсць густ, які застаецца з табой.

**Алена ДРАПКО**

**НАРОДЖАНЫЯ 17 кастрычніка**

**Незалежна ад таго, з якімі цяжкасцямі і небяспекай сутыкаюцца гэтыя людзі, яны перш за ўсё імкнуцца не страчваць асабістага душэўнага спакою. Нестабільнасць — іх самы злосны вораг, але яна разнастайная і часам ствараецца імі асабіста. Існуюць два тыпы людзей гэтага дня: адны — спакойныя і ўраўнаважаныя, у якіх заўсёды ўсё ў парадку; другія — сарвігаловы і гарэзы, для якіх жыццё без рызыкі падаецца сумным і стамляючым. Большасць з іх даволі прыдзірліва ставіцца да ацэнкі сваіх здольнасцяў. У адносінах з калегамі і сям'ёй яны заўсёды паступаюць паважліва, абдумана, але на іх падтрымку асабліва разлічваць нельга.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.41 | 18.08 | 10.27 |
| Віцебск — | 7.33 | 17.56 | 10.23 |
| Магілёў — | 7.31 | 17.58 | 10.27 |
| Гомель — | 7.25 | 17.58 | 10.33 |
| Гродна — | 7.55 | 18.24 | 10.29 |
| Брэст — | 7.53 | 18.27 | 10.34 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 15 кастрычніка. Месяц у сузор'і Льва.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Веранікі, Мікалая, Паўла, Пятра, Сцяпана, Уладзіміра.* ***К.*** *Люцыны, Малгажаты, Марыі, Андрэя, Віктара, Ігната.*

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Звінелі абодва сотавыя тэлефоны, верашчаў стацыянарны, настойліва лямантаваў у камп'ютары «Скайп». Гаспадар кватэры, які знаходзіўся ў прыбіральні, істэрычна крычаў:**

**— У дзверы пазваніце хто-небудзь, яшчэ і ў дзверы!..**

Пачуўшы фразу «Але ж я жанчына!», разумееш: аргументы ў яе скончыліся, і ў ход пайшлі козыры.

**— У вас у школе бацькоўскія сходы праводзяцца?**

**— Не, мы грошы проста праз дзяцей перадаём.**

Даты | Падзеі | Людзі

### 17 кастрычніка

**1905** год — расійскі імператар Мікалай II падпісаў маніфест «Аб удасканаленні дзяржаўнага парадку». Дакумент, падрыхтаваны графам Сяргеем Вітэ, увайшоў у гісторыю як «Маніфест 17 кастрычніка». Ён меў велізарнае значэнне для Расіі. Пад ціскам рэвалюцыйнай сітуацыі, якая складвалася на той момант, Мікалай II дэклараваў падданым імперыі палітычныя і грамадзянскія правы, адмяніў цэнзуру ў сродках масавай інфармацыі, дазволіў прафсаюзы, шматпартыйнасць. Згодна з гэтым маніфестам, у Расіі была склікана Дзяржаўная Дума — першы вопыт расійскага парламентарызму.

**1938** год — Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР зацверджаны медаль «За адвагу». Гэтая ўзнагарода вельмі паважалася і цанілася франтавікамі Вялікай Айчыннай, паколькі ёю ўзнагароджвалі выключна за асабістую мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баі. Гэта галоўнае адрозненне медаля «За адвагу» ад іншых медалёў і ордэнаў, якія нярэдка ўручаліся «за ўдзел». Усяго ж за гады вайны ім былі ўзнагароджаны 4 млн 230 тысяч савецкіх салдат.

**1961** год — адбылося адкрыццё найбуйнейшага грамадскага будынка на тэрыторыі Крамля — Крамлёўскага палаца з'ездаў, прымеркаванае да пачатку работы XXII з'езда КПСС. Зала палаца разлічана на 6000 месцаў і абсталявана з улікам найноўшых на той час дасягненняў акустычнай тэхнікі (была магчымасць рабіць пераклад адначасова на 12 моў свету). Цяпер будынак называецца Дзяржаўны Крамлёўскі палац. Тут праходзяць урачыстыя пасяджэнні і прыёмы, міжнародныя фестывалі, а таксама тэатральна-відовішчныя паказы. Але вернемся ў 1961 год. Выступаючы ў той дзень са справаздачным дакладам ЦК КПСС, Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў працягнуў пачатае яшчэ на XX партыйным з'ездзе выкрыццё культу асобы Сталіна. Упершыню ён назваў поўны склад так званай антыпартыйнай групы, заявіўшы, што гэтыя людзі нясуць «персанальную адказнасць за многія масавыя рэпрэсіі». 4800 дэлегатаў XXII з'езда КПСС прынялі Праграму пабудовы камунізму і ўхвалілі вынас з ленінскага Маўзалея цела Сталіна.

### Было сказана

**Фелікс ТАПЧЭЎСКІ, беларускі паэт XIX ст.:**

*«Можа, скажа хто, што грошы*
*Кормяць, робяць, лашчаць цела.*
*Не! Паночак мой харошы,*
*Грош — пустое, праца — дзела!».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар—галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.538. Індэкс 63850. Зак. № 4260.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 16 кастрычніка 2014 года.